Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Натар'ны прыймальня—з 9-й да 3½ гадз.

Навымарытаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрэсу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пашпарэлі наперад тэксту 1 р. — к. За радок пашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Спасылкі на 50 проц. дарожэй. Зьмяшчэньне тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Бесправолн. і чырвонаармейцы за дакумент — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЮЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 263 (2451) Пятніца, 16-га лістапада 1928 г.

Шэфпраца не павінна кульгаць.

„Правда" ў перадавіцы—«Еще раз о шефской работе»—піша:

Праведзены нядаўна агляд працы шэфскіх таварыстваў выявіў, што шэфская праца не адпавядае тым затраваньням, якія высоўвае ў сучасны перыяд партыя. За апошніх паўтара-два гады мы маем нават зьніжэньне культнага складу сяброў у шэфскіх таварыствах і асабліва слабы ўдзел у іх работніц і рабочае моладзі. Выяўляецца бюракратызацыя шэфскага руху, іспаваньне свайго роду нейкага гэдамства, а не арганізацыі шырокіх мас. Разам з тым, няма належнае увагі ўстаноўкі ў самым вымеськае шэфскае працы, няма належнае ўвагі практыцы шэфскае працы в асноўных задачамі партыі на працы на вёсцы, падкрэсьленымі XV зьездам.

XV зьезд партыі даў дырэктыву аб разьвіцьці далейшага наступу на куркулацтва. Гэта вымагае ад усіх грамадзкіх арганізацый вёскі і ад шэфаў максімернага ўзмацненьня працы па арганізацыі беднаты. Трэба наладзіць працу шэфаў так, каб яны ня толькі выяжджалі на вёску, пасылалі туды літаратуру, асобных дакладчыкаў і т. д., але і на месцы дапамагалі б ствараць такі савецкі і кааперацыйны апарат, які быў-бы здольным праводзіць лінію партыі ў галіне сацыялістычнае перабудовы вёскі. У пастанове аддзелу ЦК па працы ў вёсцы, зацьверджанай у асноўным ЦК, зазначаецца на палепшаньне і ўзмацненьне савецкага і кааперацыйнага апарату на вёсцы, як на асноўнае вымо, за якое шэфы павінны схапіцца ва ўсёй сваёй працы.

Трэба, каб шэфы непасрэдна падыйшлі б да падрыхтоўкі, выхаваньня і вывучэньня працаўнікоў для нізавога савецкага апарату. Гэтая задача на пастаноўцы на належную вышыню працы вясковага савецкага і кааперацыйнага апарату здолее быць з посьпехам ажыцьцёўлена толькі ў тым выпадку, калі ў працу шэфаў будуць уцягнуты сапраўдныя рабочыя масы, увесь асноўны актыў рабочае клясы.

Мы лічым надзвычайна важным зазначэньне ЦК аб «патрэбе ажыцьцёвіць непасрэдную сувязь гарадзкіх ячэек пралетарскае грамадзкасьці з вясковымі». Трэба, каб самыя пляны шэфскіх арганізацый былі пабудаваны на вучоце жывое канкрэтнае сапраўднасьці данае мясцовасьці, каб гэтыя пляны былі ўвязаны і пагоджаны з працаю саветаў, кааперацыі і іншых грамадзкіх арганізацый на вёсцы. Трэба таксама больш шырока, чымся да гэтага часу, выкарыстаць сувязь гарадзкіх рабочых з вёскаю. Тут вялікую ролю павінны адыграць такія арганізацыі, як зямляцтвы, як праца сярод адпускнікоў, сярод сэзонных рабочых, выкарыстаньне розных «спадручных» для палітычнае і культурнае дапамогі вёсцы в боку гораду. Трэба дамагчыся, каб фабрычна-заводзкія арганізацыі прадпрыёмстваў, якія знаходзяцца ў сельскіх мясцовасьцях, узялі непасрэдны ўдзел ва ўзмацненьні палітычнае працы ў сялянскіх масах акаляючых вёсак. Трэба дамагчыся рашучага пералому ў справе ўдзьму шэфскае працы, дамагчыся таго, каб шэфства ня было больш забытым вучасткам працы, а сапраўднаю галінаю партыйнае працы.

Набліжаюцца перавыбары саветаў. Актыўны ўдзел шэфаў у перавыбарах саветаў на вёсцы павінен стаць першаю асноўнаю праверкаю здольнасьці шэфскіх арганізацый ажыцьцяўляць адпаведныя дырэктывы партыі.

ПОЛЬШЧА--АСТРОГ ДЛЯ СЯЛЯН І РАБОЧЫХ.

ПІЛСУДЗКІ ПАВЯЛІЧВАЕ АПАДАТКАВАНЬНЕ ПРАЦОЎНЫХ МАС І ЗЬМЯНШАЕ ПАДАТКІ ДЛЯ ФАБРЫКАНТАЎ І АБШАРНІКАЎ.

Самыя элемэнтарныя вольнасьці грамады шальмуюцца жандарскім свавольствам.

Правы нацменшасьцяй у загоне.

На сэсіі польскага сойму.

ВАРШАВА, 14-XI. У сойме пры абмеркаваньні дэкларацыі міністра фінансаў і бюджэтнага законапраэкту прадстаўнік «Вызваленьня» Вазьніцкі зазначыў на рост незадаволеньня сялянскіх мас Пілсудзкім і абвінавачваў урад у тым, што ён ня выконвае пастаноў сойму. „Калі ўрад не заявіць аб перамене сваёй пазіцыі,—сказаў Вазьніцкі,—дык «Вызваленьне» пасьля першага зачытаньня бюджэтнага законапраэкту будзе галасаваць проці".

Лідэр сялянскага саюзу Домбскі зазначыў: «Раўняць польскі бюджэт з бюджэтам заходня-эўрапейскіх дзяржаў нельга. Нацыянальныя прыбыткі заходня-эўрапейскіх дзяржаў значна большыя за нацыянальныя прыбыткі польскае дзяржавы». Даючы ацэнку эканамічнага становішча Польшчы, ён зазначыў, што вельмі спрыяючая эканамічная кан'юнктура, выкліканая забастоўкаю гарнякоў у Англіі, мінула. Польшчы пагражае эканамічны крызіс. Дарагоўля расьце. Ня лічачыся з гэтым, урад павялічвае ападаткаваньне, пераважна за кошт шырокіх працоўных мас, і адначасна зьмяншае падаткі на прамыслоўцаў і абшарнікаў. Зямельная рэформа не ажыцьцяўляецца. Абяцаныя ўрадам доўгатэрміновыя пазыкі сялянству не выдаюцца.

„Становішча Польшчы пагоршаецца,—заявіў далей Домбскі. Краем кіруе не дыктатар, а яго прыхвасьні. Польская дэмакратыя ня згодзіцца на зьмену польскае канстытуцыі».

Нарэшце Домбскі кажа, што сялянскія дэмакраты, не зважаючы на ўрадавы тэрор, ня спыняць крытыкаваць урад. Сялянскі саюз будзе галасаваць за перадачу законапраэкту ў бюджэтную камісію, каб там давялі бязглузьдзіцу бюджэтнага законапраэкту ў сучасных польскіх варунках.

Прадстаўнік украінскае радыкальна-сацыялістычнае партыі Бачынскі ў сваёй прамове наконт 10-х угодак польскае дзяржавы заявіў: «Польшча пераймае самыя горшыя прыклады імпэрыялістычных дзяржаў, польскі ўрад адабраў усе дасягненьні, якіх украінцы дамагліся ў Аўстрыі. Далей Бачынскі спыніўся на злоўжываньнях, дапушчаных урадам у часе выбараў і заявіў, што міністр унутраных спраў Складкоўскі нагла парушаў грамадзянскія вольнасьці».

Наконт львоўскіх падзей Бачынскі спрачаўся з Складкоўскім, які заявіў, што паліцыя нявінна ў гэтых падзеях. У гэты час Складкоўскі з месца выгукнуў: „Так, яна вінна ў тым, што была вельмі мяккаю да украінцаў". Гэтыя словы выклікалі гучныя пратесты на лаўках украінцаў. Бачынскі зьвярнуўся да Складкоўскага з такімі словамі: «калі вас выкінуць з пасады міністра ўнутраных спраў, дык вы здолееце в посьпехам заняць пасаду гарадавога і, такім парадкам, выявіць свае здольнасьці».

Нарэшце Бачынскі сказаў: «Калі мы аб'ядноемся з іншымі нацыянальнымі меншасьцямі, дык у нас хопіць сіл, каб дамагчыся вызваленьня. Вы чакалі свайго вызваленьня на працягу 150-ці годаў; мы даможамся гэтага хутчэй». Апроч таго, Бачынскі заявіў, што фракцыя, якую ён прадстаўляе, будзе галасаваць проці бюджэтнага законапраэкту.

РАСЬСЬЛЕДВАНЬНЕ ЛЬВОЎСКАГА ПАГРОМУ Ў РУКАХ... САМІХ ПАГРОМШЧЫКАЎ.

ВАРШАВА. 14-XI. На пасяджэньні сойму абмяркоўвалася запытаньне УНДО і украінскае радыкальна-сацыялістычнае партыі наконт львоўскіх падзей. Прадстаўнік УНДО патрабаваў адстаўкі львоўскага ваяводы Галухоўскага. Украінская радыкальна-сацыялістычная партыя патрабавала, каб сойм зараз-жа склаў камісію для расьсьледаваньня львоўскіх падзей.

Беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам прачанаваў даручыць расьсьледаваньне львоўскіх падзі й ураду. Дэпутат беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам Станіслаў Стронскі заявіў, што, калі ўрад «дасьць украінцам нацыянальную самастойнасьць, дык Львоў хутка апыніцца ў руках бальшавікоў». Прадстаўнік камфракцыі Бітнэр заявіў, што ПОЛЬСКАЯ ДЗЯРЖАВА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АСТРОГАМ ДЛЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЬЦЯЙ. У часе дэбатаў Бітнэра прысутныя ў залі міністры на чале в прэм'ерам Бартэлем дэманстрацыйна пакінулі залю.

Пры галасаваньні тэрміновасьць прапаноў УНДО і украінскае радыкальна-сацыялістычнае партыі адхілена. Тэрміновасьць прапаноў беспартыйнага блёку супрацоўніцтва в урадам прынята.

Аб'яднаньне УНДО і украінскіх радыкал-сац. не адбылося

ВАРШАВА. 14-XI. У палітычных колах паведамляюць, што УНДО (украінскае нацыянальна-дэмакратычнае аб'яднаньне) гэтымі днямі зьвярнулася да ўкраінскае радыкальна - сацыялістычнае партыі з прапановаю заснаваць адзіную украінскую фракцыю ў сойме. Украінская радыкальна-сацыялістычная партыя прапанову УНДО адхіліла.

Арышты ў Заходняй Беларусі.

Некальні дзён таму назад на вакзале ў Лідзе затрыман быў нейкі чалавек, у якога ў часе рэвізіі знойдзены грошы і «дакументы вельмі падазронага зьместу», як піша „Кур'ер Віл." (№ 260). На аснове быццам прызнаньняў гэтай невядомай асобы арыштавана „цэлая шайка, у якой знайшоўся і адзін працаўнік вайсковай друкарні ў Варшаве».

Пасланец эстонскае ваеншчыны.

ВАРШАВА, 14-XI. Пілсудзкі наведаўся да эстонскага генэрала Ляйдонэра, які прыехаў у Польшчу на сьвяткаваньне 10-х угодак існаваньня польскае дзяржавы. Увечары быў наладжан банкет у чэсьць Ляйдонэра.

Польская паліцыя ў якасьці ўзброенае сілы.

Нямецкая часопісь «Паліцыя» падае цікавыя матар'ялы аб значэньні польскае паліцыі ў агульнай падрыхтоўцы краю да вайны і аб залежнасьці яе ад арміі.

Яшчэ раней шы закон 1919 г. зварочваў асаблівую ўвагу зацікаўленых інстанцый на асаблівую важнасьць чыста вайсковага выхаваньня і абучэньня паліцыі. Вайсковаму міністэрству гэтым законам было нададзена права рантоўнага кантролю і дачы інструкцый наконт выхаваньня і абучэньня паліцыі. Дзеля гэтага існавалі спэцыяльна пазначаныя афіцэры санраўднае службы ў якасьці інспэктароў паліцыі. Новы закон 1928 г. мае разьдзел пад загалоўкам «Дапамога дзяржаўнае паліцыі—арміі пры абароне краю» (гл. IV), в якога выразна відаць, што ў часе абвяшчэньня вайны паліцыя становіцца часткаю агульных узброеных сіл дзяржавы і ўваходзіць у склад арміі ў якасьці вайсковае адзінкі, якая выконвае службу забясьпекі. Галіна ўплыву вайсковае паліцыі ў ваенны час устанаўляецца ўзаемным пагоджаньнем міністраў: вайсковага, унутраных спраў і фінансаў. Вайсковаму міністру надаецца права кантролю ў сэнсе падрыхтоўкі паліцыі на выпадак вайны на тэрыторыі ўсяе дзяржавы, а начальнікам корпусных акругаў—на тэрыторыі, падначаленай ім у ваенных адносінах.

З моманту далучэньня паліцыі да складу ўзброеных сіл краю, паліцэйскія чыноўнікі і радавыя набываюць адпаведныя вайсковыя чыны.

Шчыльнае ўзамадзеяньне між паліцыяй і арміяй прадугледжваецца і ў статутах і ў пастаўленьнях на выхаваньні і абучэньні паліцыі. Кожны паліцэйскі павінен перад прыёмам у паліцыю прайсьці вайсковую службу.

Для афіцэраў і унтэр-афіцэраў польскае арміі доступ у паліцыю непасрэдна з арміі зусім вольны.

Навучальны плян вайсковага навучаньня паліцыі складаецца са згоды вайсковага міністэрства і міністэрства ўнутраных спраў. Каб паглыбіць вайсковую падрыхтоўку паліцэйскіх, вайсковы міністр назначае в ліку вайсковых спэцыялістаў асобных інструктароў. Дзеля гэтага-ж частка паліцэйскіх афіцэраў прыкамандыроўваецца для выкананьня штатных пасад у вайсковыя часьці.

У выпадку адсутнасьці штатных пасад у паліцыі, узятых на паліцэйскую службу асобы залічваюцца у спэцыяльны запас паліцыі, які праходзіць абучэньне на тых самых асновах і атрымлівае поўны аклад пэнсіі; залічваюцца-ж новапрынятыя ў паліцыю асобы на штатныя пасады (ці ў запас) пасьля трохгадовае службы дзеля спробы. Такім парадкам, вароч штатных ёсьць значны розэрв паліцэйскіх.

(«Красная Звезда»).

ЗДРАДА НАВІСЛА НАД МЭТАЛЁЎЦАМІ РЭЙН-ВЭСТФАЛІІ.

РЭФАРМІСТЫ ГАТОВЫ КАПІТУЛЯВАЦЬ

Спатканьне прафбюракратаў з капіталістамі.

БЭРЛІН, 14-XI. Учарайшая нарада прадстаўнікоў прафсаюзаў і прадпрыемцаў у Бэргемана (меншавік, камісар Дусэльдорфу) выявіла, што ў прынцыпе абодвы бакі гатовы да перамоў.

Прадпрыемцы высоўваюць наступныя ўмовы: праца неадкладна павінна быць адноўлена; перамовы аб заработку павінны пачацца толькі пасьля аднаўленьня працы. Лідэры прафсаюзаў рыхтуюць капітуляцыю перад прадпрыемцамі і намераны адкласьці працу бліжэйшымі днямі.

З прычыны такога становішча цэнтральны камітэт кіраўніцтва барацьбою выказаўся за неадкладнае заснаваньне актыўнае аховы ад рознага роду штрэйкбрэхерства на ўсіх прадпрыёмствах, за спыненьне працы на безапаснасьці, за ўзмацненьне збору сродкаў і за склік агульных сходаў рабочых на ўсіх прадпрыёмствах. *На сходах павінны быць растлумачаны здрадніцкія пляны рэфармістаў і ўжыты захады да перамогі над імі.*

ЗАВОДЧЫКІ ПАШЫРАЮЦЬ ЛЁКАУТ.

ЯШЧЭ 35.000 МЭТАЛЁЎЦАЎ ВЫКІНУТА НА ВУЛІЦУ.

БЭРЛІН, 14-XI. Агэнцтва Вольфа паведамляе з Гагену: «Саюз прадпрыёмцаў мэталёвае прамысловасьці Марскога райёну (у які ўваходзяць акругі Альтэн, Бохум, Гален, Гамм і Ізэрлен, Вэстфальскае вобласьці) абвясьцілі аб звальненьні з 30-га лістапада 35.000 рабочых, якія працуюць на 300 прадпрыёмствах».

Рэйхстаг не абароніць...

БЭРЛІН, 14-XI. У опрэчках у рэйхстазе наконт лёкауту ў Рэйнска-Вэстфальскай мэталёпрамысловасьці ад імя сацыял-дэмакратычнае фракцыі выступіў адзін з кіраўнікоў агульна-нямецкага саюзу мэталёўдаў Брандэс, які ў агульным паўтарыў дакады міністра працы сацыял-дэмакрата Вісэля.

Нацыяналіст Ліндэйнэр-Вільдау заявіў, што прадпрыёмцы ня будуць ужываць лёкауту толькі тады, калі прафсаюзы адмовяцца ад забастовак.

ТОЛЬКІ КАМФРАКЦЫЯ ЗА ДАПАМОГУ НЕАРГАНІЗАВАНЫМ.

БЭРЛІН, 14-XI. Абраны лёкаутаванымі рабочымі ў Рэйнска Вэстфальскай мэталёпрамысловасьці цэнтральны камітэт кіраўніцтва барацьбою паслаў у Бэрлін дэлегацыю з прадстаўнікоў буйнейшых прадпрыёмстваў для перамоў з французкімі рэйхстагу аб выплаце дапамогі. Член партыі цэнтру (лідэр «хрыстыянскіх» прафсаюзаў) Штэнгервальд выказаўся за выплату дапамогі па беспрацоўі Сацыял-дэмакрат Брандэс (адзін з кіраўнікоў агульна-нямецкага саюзу мэталёўдаў) даў ухільны адказ, а Мэтц (адзін з дзеячоў таго-ж саюзу) замест адказу на суткасьці рашуча адмовіўся ад «супрацоўніцтва з неарганізаванымі рабочымі». Толькі камфракцыя рэйхстагу абвяшчала падтрыманьне ўсім лёкаутаваным рабочым.

Клясавыя бойкі ў Францыі.

СУДНАЎЛАСЬНІКІ БАРДО ГАТОВЫ ЗДАЦЦА.—САЛІДАРНАСЬЦЬ ІНШЫХ ПАРТОЎ З СТАЧАЧНІКАМІ БАРДО.

ПАРЫЖ, 14-XI. Саюз уласьнікаў суднаў у Бардо паведамляе, што бастуючыя партовыя рабочыя згадзіліся ўладзіць канфлікт пры пасрэдніцтве Пуанкарэ. Пуанкарэ прыцягнут да пасрэдніцтва па ініцыятыве мэра Бардо і дэпутата-сацыяліста Марке.

Як паведамляе „Юманітэ", учора адбыўся масавы сход бастуючых, на якім прадстаўнік унітарнае канфэдэрацыі працы заклікаў рабочых не згаджацца на прымусовы арбітраж. Сябра забастовачнага камітэту Кокстан паведаміў сходу, што забастовачны камітэт адхіліў прапанову ўласьнікаў суднаў, ад арбітражы, але згадзіўся, каб прадстаўнікі бастуючых спаткаліся з прадстаўнікамі ўласных суднаў у прыватнасьці Пуанкарэ. Аднак, забастовачны камітэт загадзя адхіляе прымусовы арбітраж.

Партовыя рабочыя Бле (порт, недалёка ад Бардо) абвясьцілі забастоўку салідарнасьці в сваімі таварышамі ў Бардо. Партовыя рабочыя Лярошэлю (порт на захадзе Францыі) адлічылі дзённы заработак на карысьць бастуючых партовых рабочых у Бардо.

СТЫХІЙНЫ ВЫБУХ СТАЧАК НА ПАПЯРОВЫХ ФАБРЫКАХ.

ПАРЫЖ, 14-XI. Учора забаставала блізка 3-х тысяч рабочых папяровых фабрык у Лембры, Гондардэні і ў трох іншых мясцовасьцях лагчыны рэчкі Аа. Учора-ж да забастоўкі далучыліся папяровікі яшчэ двух бліжэйшых мясцовасьцяй. Як паведамляюць газэты, у раёне, ахопленым забастоўкаю, выслены атрады жандараў.

Палітычнае і юрыдычнае лёгкадумства бэрлінскага суда.

Савецкія юрысты аб дамаганьнях белаэмігрантаў на аукцыёне каштоўнасьцяй

МАСКВА 15-11. Памоцнік начальніка Ўгаворна-прававое управы НКГандлю СССР

праф. Вольф

у гутарцы з супрацоўнікам ТАСС заявіў наконт існаў расейскіх эмігрантаў і пастановы бэрлінскага суду на справе аб аукцыённым продажу належачых СССР каштоўнасьцяй наступнае:

Спробы некаторых расейскіх эмігрантаў у Нямеччыне сарваць наладжаны ў Бэрліне савецкім гандлёвым прадстаўніцтвам аукцыён і дамагчыся атрыманьня некаторых з прызначаных для аукцыённага продажу рэчаў мастацтва і старажытнасьці, я разглядаю, як зусім адкрытае імкненьне гэтых асоб выклікаць да сябе палітычныя сымпатыі нямецкага суду.

З выключна юрыдычнага пункту гледжаньня гэтае выступленьне павінна быць прызнана пазбаўленым усякіх сур'ёзных падстаў. Пасьля таго, як Нямеччына падпісала в Савецкім Саюзам шэраг міжнародных угавораў, з якіх некаторыя, як напрыклад, Рапальскі ўгавор, непасрэдна прызнаюць праваемнасьць за актамі нацыяналізацыі, учыненымі савецкім урадам было-б зусім безнадзейна ўзьнімаць у Нямеччыне пытаньне, наб гэтыя законы аб нацыяналізацыі не падпадалі прыстасаваньню на нямецкай тэрыторыі.

Нямецкі суд яшчэ ня выказаў сваіх адносін да гэтае справы. Дапушчанае ім забясьпечаньне іску зьвяўляецца толькі папярэднім актам. Я ўпэўнен, што справа паройдзе ў отадыю разгляду па аўтнасьці і як толькі суд бліжэй азнаёміцца з фактычным і прававым станам справы, дык ён зараз-жа адхіліць безпадстаўныя дамаганьні іскоў.

Вядомы знаўца міжнароднага права

Е. А. Каровін

у гутарцы з супрацоўнікам ТАСС заявіў наконт пастановы грамадзянскага сэнату бэрлінскае судовае палаты так:

Пастанова нямецкага суду аб перадачы ў дазвіт каштоўных рэчаў і забарона продажу частка рэчаў, выстаўленых на савецкім аукцыёне ў Бэрліне, зьяўляецца тым больш дзіўнымі, што нават такія краі, як Англія і Амэрыка (першая нават перад прызнаньнем нас дэ-юрэ, а Злучаныя Штаты, якія не прызнаюць нас ні дэ-юрэ, ні дэ-факто і цяпер) адхілялі дамаганьні прыватных асоб да савецкага ўраду ў такіх выпадках. Цікава зазначыць, як на кур'ёз, што на працесе па адной з такіх спраў у Амэрыцы іскец нізоднага разу не ўпамінаў «савецкі ўрад" у якасьці адказчыка, называючы яго „карпарацыяй, якая мае ўладу ў чаотцы Зўропы і Азіі". Не зважаючы на гэта, суд прызнаў, што пакольгі гэтая „карпарацыя» мае ўсе адзнакі ўрадавае ўлады, пастольні яна ня можа быць прыцягнута да судовае адказнасьці ў якасьці абвінавачанага. Практыка нямецкіх судоў да гэтага часу таксама была справядліваю ў адносінах такіх спраў, прычым нямецкія суды бясспрэчна прызнавалі ня толькі нашыя акты наконт нацыялізацыі, але і нашыя заканадаўчыя акты ва ўсіх іншых галінах дзяржаўнага жыцьця, як, напрыклад, наш закон аб алімэнтах, які прыстасоўваецца нямецкім судом у адносінах да расейскіх эмігрантаў. Такім парадкам агульныя прынцыпы міжнароднага права, практыка чужаземных судоў у краёх, якія ня прызналі СССР, прэтэндэнты ў пастановах нямецкіх судоў па такіх справах і, нарэшце, факт прыцяцьленага эканамічнага супрацоўніцтва між Нямеччынаю і СССР прымушаюць нас гандзець на пастанову бэрлінскага суду, як на сумнае непаразуменьне, якое павінна быць як мага хутчэй ліквідавана.

Масавыя арышты ў Латвіі.

РЫГА. 14-11. У зьвязку з 11-ай гадавінай Кастрычніка за апошнія два дні ў адной толькі Рызе арыштавана каля 30 чалавек за ўдзел у «часовых забастоўках, праведзеных на фабрыках і заводах 7-га лістапада». Арыштавана некалькі супрацоўнікаў газэты рабоча-сялянскага блёку «Дарбс Ун Майзэ».

Рабоча-сялянская фракцыя падала ў сойм запытаньне наконт масавых арыштаў.

ПРАЭКТ АМНІСТЫІ АДХІЛЕН.

РЫГА. Сойм адхіліў сацыял-дэмакратычны праэкт амністыі большасьцю 47--мі проці 6-ці.

ВАКОЛ ЗАМАХУ НА ЛАТВІЙСКАГА ПРЭЗЫДЭНТА.

Рыга. „Фашысцкая Латвія" называе паведамленьне пра замах на поезд латвійскага прэзыдэнта разлутай сэнсацыяй. Водлуг слоў газэты, ніякае катастрофы здарыцца не магло, бо сякера на рэйках выкрыта за гадзіну да праходу поезду прэзыдэнта.

У Саюзных Рэспубліках.

АЗДАРАЎЛЕНЬНЕ НІЗАВОГА КААПЭРАЦЫЙНАГА АПАРАТУ.

(Пастанова ЦК УсеКП(б).

МАСКВА. Заслухаўшы даклад аддзелу ЦК па працы на вёсцы, аб выніках праверкі кіруючых кадраў сельска-гаспадарчае і спажывецкае кааперацыі ў хлебазагатоўчых і сыравінных раёнах, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) адзначыў у сваёй пастанове наліччa значнае забруджанасьці нізавога вясковага кааперацыйнага апарату і яго сярэдніх зьвеньняў кулакаварожымі і наўстойчывымі элемэнтамі (14 проц. агульнага ліку праверэных), нізкую кваліфікацыю і відочную няпрыгоднасьць да выконваемае працы (16 проц.) і ў зьвязку з гэтым наліччa перабытваньняў партыйнае лініі.

Грунтуючыся на выяўленых праверкаю недахопах і маючы на ўвазе ўсё ўзрастаючую ролю кааперацыі ў справе сацыялістычнае перабудовы сельскае гаспадаркі і ўпарадкаваньня рынку, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) лічыць патрэбным: правесьці надыходзячыя перавыбары кааперацыйных органаў пад лёзунгам масавае праверкі кадраў і ачыстку выбарных органаў ад кулакава-варожых, непрацаздольных і бюракратычных элемэнтаў; ажыцьцёвіць шэраг мерапрыёмстваў па падрыхтоўцы і сыстэматычным вылучэньні новых кадраў кааперацыйных працаўнікоў, у першую чаргу, з рабочага і батрацка-бядняцкага актыву вёскі; узмацніць і пашырыць сетку кааперацыйных тэхнікумаў у райёнаваных абласьцёх; даручыць фракцыі цэнтрасаюзу і саюзу эзюзаў распрацаваць захады да пераводу некаторых працаўнікоў з гораду дзеля ўзмацненьня саюзных і нізавых зьвеньняў вясковае кааперацыі; прапанаваць аб сным аб'яднаньням кааперацыі разам з аддзелам ЦК па працы на вёсцы ў двухмесячны час падаць у ЦК прапанову аб падрыхтоўцы кааперацыйных працаўнікоў у вышэйшых навучальных установах; даручыць аддзелу ЦК па працы на вёсцы і арганізацыйна-разьмеркаваўчаму аддзелу ў працягу месяца накіраваць 100 працаўнікоў у сельска-гаспадарчую кааперацыю для адказнае працы ў абласных, губэрскіх і акруговых саюзах.

Збожжазагатоўкі на вышыні.

МАСКВА. Водлуг вестак НК Гандлю СССР за 10 дзён лістапада загатоўлена 280.398 тон збожжавага хлеба. Загатоўчы плян лістапада па збожжавым хлебе выканан за гэтыя дні ў разьмеры 24,8 проц.

Усё бліжэй да міжнароднага праф'адзінства.

МАСКВА, 13-11. У Маскву вярнуўся старшыня ЦК саюзу камунальнікаў Целяшоў, які выяжджаў у Осло (Нарвэгія) для ўдзелу ў працы кангрэсу нарвэскіх камунальнікаў, які адбываўся 25-31 кастрычніка. З прычыны несваячнасьці атрыманьня належнае візы, Целяшоў ня мог узяць непасрэднага ўдзелу ў працы кангрэсу.

Кангрэс выказаўся за зацьверджаньне пастаноў Капэнгагенскае канфэрэнцыі ЎЦСПС і аб'яднаньня прафсаюзаў Нарвэгіі і Фінляндыі наконт угавору адзінства і прыязьні між прафсаюзамі гэтых краёў.

Няшчасны выпадак у адэскім порце.

Міканаеўск. 9-га лістапада в 10-й гадз. вечара на тэрыторыі гандлёвага порту матрос—вучань італьянскага судна «Капо-Вада» Амброзіё, варочаючыся з гораду і праходячы ля складаў накіраваўся да вартаўніка, які стаяў там на варце. Вартаўнік пачаў пачашчана непераджаць італьянскага марака выгукамі і гестамі, зазначаючы што трэба перайсьці на другі бок. Не зважаючы на папярэджаньне, Амброзіё накіраваўся проста на вартаўніка. Апошні стрэліў і параніў на сьмерць Амброзіё, які на дарозе ў больніцу памёр. На месца нішчаснага выпадку выехала судовая і сьледчая ўлада і прадстаўнікі акрыванкому. Распачата дазнаньне. Пра здарэньне паведамлена прадстаўніцтву НК па замежных справах у Адэсе. Старшыня выканкому тэлеграфна выказаў жаль італьянскаму консулу ў Адэсе і зьвязку са здарэньнем. Згодна даручэньня акрвыканкому, начальнік гандлёвага порту паведаў італьянскі параход і выказаў капітану жаль в прычыны здарэньня.

Братняя дапамога ад транспартнікаў СССР.

Прэзыдыум ЦК саюзу транспартнікаў паслаў на данамогу бастуючым транспартным рабочым Фінляндыі ў дадатак да ранейшых 5-ці тысяч—яшчэ 5 тысяч рублёў.

Два новых лесавозы.

ЛЕНІНГРАД, 14-XI. На Балтыцкім суднабудаўнічым заводзе скончана пабудова 2-х новых марскіх лесавозаў «Сако» і «Ванцэці». Кожны з іх мае грузаўздымнасьць у 3 з паловаю тысячы тон. Пабудова суднаў каштавала на 15 проц. таньней ранейшых лесавозаў.

Агрэсыўны паварот Амэрыкі.

ПРАМОВА КУЛІДЖА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ПЛЯТФОРМАЙ ГУВЭРА.

НЬЮ-ЙЁРК, 13-XI. У прамове ў дзень 10-х угодак замірэньня прэзыдэнт Кулідж быў фактычна рупарам палітыкі Гувэра. Кулідж патрабаваў, каб эўрапейскія дзяржавы выплачвалі свае даўгі і пагражаў спыніць выдачу пазык Эўропе. Гэта цалкам супадае з заявамі Гувэра.

У палітычных колах падкрэсьліваюць, што падарожжа Гувэра па Паўднёвай Амэрыцы, апошняя прамова Куліджа, а таксама праграма марскога міністэрства сьведчаць, што Гувэр будзе прытрымлівацца больш агрэсыўнай палітыкі, чымся яго папярэднік.

ГУВЭР НЯСЕ ЗАКАБАЛЕНЬНЕ ЛАЦІНСКАЙ АМЭРЫЦЫ.

НЬЮ-ЁРК, 14-XI. Уорнэра Партыі (камуністычная партыя Злучаных Штатаў) выдала братэрскім кампартыям краёў Лацінскае Амэрыкі тэлеграму, у якой выкрывае так званае падарожжа «добрых пажаданьняў» Гувэра ў Лацінскую Амэрыку. Тэлеграма называе падарожжа «загрозным крокам у напрамку да ўвекавечаньня панаваньня імпэрыялізму Злучаных Штатаў у Лацінскай Амэрыцы». Тэлеграма прызывае кампартыям краёў Лацінскае Амэрыкі зараз-жа распачаць наладжаньне масавага руху пратэсту проці падарожжа Гувэра.

„Дасягненьні" цьвёрдалобага ўраду.

ЛЁНДАН, 13-XI. «Дэйлі Геральд", абмяркоўваючы прамову Куліджа, піша: „У сучасны момант, не зважаючы на розныя супакойваючыя сказы, усё больш выпукляюцца ў наяўнасьці ўсе складаныя часьці канфлікту між Англіяй і Паўночна-Амэрыканскімі Злучанымі Штатамі. Маецца вострае прамысловае і гандлёвае выпярэдніцтва; існуе атмасфера западозранасьці і варожасьці ва ўзаемаадносінах між урадамі абодвых краёў; існуе выпярэдніцтва ва ўзброеньнях».

У канцы газэта кажа: «У наяўнасьці два дасягненьні Бальдвіна і Чэмберлена: варожасьць Англіі ў адносінах да СССР і небясьпечная нявызнана ва ўзаемадачыненьнях з Паўночна-Амэрыканскімі Злучанымі Штатамі; у кожным з гэтых дасягненьняў хаваюцца магчымасьці вайны».

ЛЁЙД ДЖОРДЖ «БАРОНІЦЬ» САВЕЦКІ ПРАЭКТ РАЗБРОЕНЬНЯ.

ЛЁНДАН, 14-XI. У сваёй прамове ў палаце вобшчын Лёйд Джорж закрануў, між іншым, савецкія прапановы аб разброеньні.

«Я лічу вялікаю памылкаю,—сказаў ён,—што савецкія прапановы аб разброеньні палічылі толькі прычынкаю да кпін. У той момант, калі гэты вялізны край эканамічна агродзіцца, дык вельмі пагрозным варункам будзе існаваньне такое дзяржавы, як ён, з неабмежаваным запасам існуючага пад яго загадам чалавечага матар'ялу, у склад якога ўваходзіць шмат самых здаваных людзей у сьвеце, прытым з дабрай амуніцыяй. Калі савецкі ўрад, водлуг эканамічных меркаваньняў, лічыць магчымым разброеньне або скарачэньне ўзброеньняў, дык трэба было-б больш сур'ёзна узяць пад увагу зроблення ім прапановы».

Аварыя марскога параходу.

ЗАГІНУЛА 107 ЧАЛАВЕК.

НЬЮ-ЁРК. Пацярпеў крушэньне параход, які плыў з Нью-Ёрку ў Паўднёвую Амэрыку з 129-цю пасажырамі і экіпажам у 210 чалавек. Большасьць людзей выратавана суднамі.

НЬЮ-ЁРК, 13-XI. Водлуг апошніх паведамленьняў, параходы, падплыўшыя да параходу «Вэстрыо», які папярпеў аварыю на шляху з Нью-Ёрку ў Паўднёвую Амэрыку, выратавалі 222 чалавекі пасажыраў і наманды. 107 чалавек загінула. У ліку адсутных—капітан параходу.

„АБЛАВА" НА САВЕЦКУЮ ЛІТАРАТУРУ.

ВЕНА. Водлуг паведамленьняў румынскіх газэт, у Кішынёве «выкрыт» і канфіскован склад кніжок, часопісяў і нот, выдадзеных у СССР. Выдаваньні знаходзіліся ў кнігарні «Кніга».

У паліцэйскім паведамленьні зазначана, нібыта гэтая літаратура дастаўлена ў Румынію кантрабандаю праз Днестр, і нібыта ў Кішынёве выкрыта некалькі «нелегальных бібліятэк», пераважна для

На палітычным кругавідзе.

Палявеньне мас у Англіі.

Пры муніцыпальных выбарах, адбыўшыхся нядаўна ў Англіі, Партыя Працы перамагла кансерватараў, а часткаю і лібэралаў, здабыўшы звыш 150 новых мандатаў. Гэты факт, як і перамога Партыі Працы пры дадатковых выбарах у парлямант, досыць яскрава сьведчаць аб палявеньні ангельскага грамадзянства, што ў свой чарод зьяўляецца найлепшым гараскопам для вялікай выбарчай кампаніі ў парлямант, якая адбудзецца вясною.

Адвой з прычын палявеньня настрояў ангельскага грамадзянства зьяўляецца заключэньне Англіяй і Францыяй ваенна-марской згоды, якая сваёй галоўнай мэтай—мела прымусіць Злучаныя Штаты Амэрыкі адмовіцца ад выкананьня сваёй вялікай марской праграмы. Заключэньнем гэтай згоды ангельскія і францускія капіталісты і імпэрыялісты хацелі пераканаць сваіх амэрыканскіх канкурэнтаў, што з імі ня так лёгка справіцца. Аднак, вышла іначай. Сярод ангельскага грамадзянства паднялася хваля нездаволеньня тым, што, дзякуючы згодзе з Францыяй, псуюцца адносіны з Амэрыкай. Ангельскія кансэрватары перапалохаліся, і сярод іх зьявіліся нават праціўнікі збліжэньня з Францыяй.

У свой чарод і амэрыканскі прэзыдэнт Кулідж энэргічна зарэагаваў на англа-францускую марскую згоду. Кулідж наогул гаварыў з незахованай варожасьцю ў адносінах да Англіі і Францыі. Ён проста прыгразіў спыненьнем п а з ы к эўрапейскім дзяржавам, калі яны не скароцяць узброеньняў.

Так багаты амэрыканскі дзядзька сярдзіта прыкрынуў на сваіх эўрапейскіх пляменьнічкаў, а гэтыя апошнія перапалохаліся і пачырванелі. Гэта зьяўляецца яшчэ лішнім доказам таго, што грызьня паміж імпэрыялістамі няўхільна вядзе да палявеньня мас і... рэвалюцыі.

Урадавы крызіс у Румыніі.

Паварот налева адбываецца таксама і ў Румыніі, гэтай цытадэлі эўрапейскай рэакцыі. У Румыніі яўнай дыктатуры як быццам і няма, але яна крыецца пад маскай парлямантарызму пры поначы фабрыкаваньня выбараў самым цынічным спосабам. Дзякуючы славутным выбарчым урнам з падвойным дном уладу захапіла ў свае рукі партыя «лібэральная», якая кіравала дзяржаўным жыцьцём Румыніі спачатку пад прэм'ерствам Іонэля Браціану, а пасьля яго сьмерці кіруе над правадырствам Вінціля Браціану. Як гэтыя ўрады выглядалі, ня трэба доўга гаварыць: уціск народу, душэньне нацыянальных меншасьцяў,—асабліва яўрэяў, зладзействы—вось асноўныя мэтады панаваньня гэтай клікі.

Мала таго,—тэрарызуючы з аднаго боку грамадзянства, лібэралы з другога боку страшылі Рэгенцыйную Раду, якая апекуецца шасьцігадовым каралём, што яны пасадзяць на трон былога наступніка трону караля. Румынскі народ далей вытрымаць ня мог.

Яшчэ ўлетку быў плянаваны паход грамады сялян на Бухарэст. Правадыры нацыянальнай сялянскай партыі спалохаліся тады сапраўднай рэвалюцыі і паход спынілі. Абурэньне мас на гэтым ня скончылася і нядаўна вылілася ў новыя шматлюдныя дэманстрацыі пратэсту.

Рэгенцыйная Рада врабіла, урэшце, рашучы націск на Браціану і ён падаўся ў адстаўку з усім сваім урадам. Зьявілася пытаньне, каму даручыць фармаваньне новага ўраду. Найбольшай партыяй зьяўляецца нацыянальная сялянская партыя (зараністы), правадыром якой зьяўляецца Маніў. Рэгенцыйная Рада спачатку запрапанавала ўтварыць кааліцыйны ўрад з удзелам зараністаў, народнай партыі (ген. Авэрэску), лібэральна-сялянскай партыі (Люпу) і народна-дэмакратычнай партыі (Ёрга). Місію ўтварэньня новага габінэту давярылі Тытулеску, б. міністру замежных спраў, ад чаго ён пад націскам масавых дэманстрацый прымушан быў адмовіцца і тады Рэгенцыйная Рада даручыла фармаваньне габінэту правадыру зараністаў п. Маніу. Габінэт ужо сфармаваны выключна з зараністаў. Зараністы спадзяюцца разрадзіць атмасфэру і адтэрмінаваць рэвалюцыйную буру, якая гатова прапесьціся над галовамі румынскіх баяр. Яшчэ пытаньне, ці ўдасца Маніу спыніць разьвіцьцё рэвалюцыйнага руху сярод румынскіх работнікаў і сялян, якія ўсё больш пераконваюцца, што адзіным шляхам іх вызваленьня ад прыгнёту зьяўляецца рэвалюцыйны шлях.

Новы прэзыдэнт у Амэрыцы.

Людна́сьць Злучаных Штатаў Паўночнай Амэрыкі ў часе толькі што адбыўшыхся выбараў прэзыдэнта падзялілася ў большасьці на дзьве партыі: рэспубліканцаў і дэмакратаў, праграмы якіх мала чым між сабою розьняцца. Выбарамі ў Амэрыцы кіруе выключна буржуазея, галоўным чынам вялікія капіталісты, рабочая-ж кляса з аднаго боку ня мае тых агромадных грошай, якія патрэбна, каб выграць кампанію ў гэтым зматэрыялізаваным краі, а з другога боку амэрыканская буржуазія задобрывае працуючых пры поначы ўдзелу іх у зысках, а таксама пры помачы забароны ўезду ў Злучаныя Штаты новых эміграцкіх мас. Нашто-ж тады галасаваць за дэмакрата Сміта? Яго «мокрасьць» буржуазі ня вельмі патрэбна, бо яна і так заўсёды знойдзе алкаголь, які прывозіцца ў Штаты кантрабандай. Сьміт хацеў быць лібэральным на пунктах іміграцыі і прагібіцыі (забароны алкаголю) і пры гэтым ён каталік. Яго праціўнік Гувэр выкарыстаў гэтыя тры «слабыя» пункты Сміта і яго выбралі прэзыдэнтам. Можна думаць, што папярэдняя ўнутраная і замежная палітыка Злучаных Штатаў ня зьменіцца, а можа стане яшчэ больш эгаістычна-імпэрыялістычнай і кансэрватыўнай.

Становішча рабочай клясы ад гэтага не палепшыцца, а пагоршыцца, бо трэба прыняць пад увагу, што сучасная прамысловая тэхніка, асабліва амэрыканская, высунула рэклямаваны цяпер новы прынцып «Навуковай арганізацыі працы». Прынцып гэты мае даць прадукцыі, як кажуць—«максымум машыны і мінімум жывога работніка». Прынцып гэты вельмі пашыран у Амэрыцы і даў ёй сапраўды нячуваны поступ у павялічэньні выдатнасьці прадукцыі. Але побач з «прамысловым росквітам» краю прынцып гэты стварыў вялізарную армію беспрацоўных, якая дайшла да лічбы звыш 4 міліёнаў... Узрост гэтай арміі беспрацоўных даецца ўжо ў знакі амэрыканскай буржуазэі з усіх бакоў і ў выніку «нячуванага гаспадарчага росквіту».

М. Л—н.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Загатоўка на Аршаншчыне.

Зараз у Аршаншчыне загатоўчы апарат праверены і ў некаторых мясцох адноўлен. Узаемадносіны паміж загатоўцамі сёлета больш нармальныя, чым у мінулым годзе.

Загатоўкі збожжа пакуль што ідуць слаба—выканана за першы квартал 90,5 проц., а за 20 дзён кастрычніка толькі 10 проц. Прычыны гэтаму—слабы завоз у округу збожжа для насельніцтва гораду; на мясцох назіраецца актывізацыя кулацтва ў сэнсе закупкі збожжа на базарах; наглядаецца наплыў «мяшочнікаў»—скупшчыкаў з-за межаў Беларусі.

У выніку ўсяго гэтага цэны базарныя разыходзяцца з цэнамі канвэнцыйнымі: пуд жыта па канвэнцыйнай цане каштуе 1 руб. 40 кап., а на базары дасягае да 4 руб. 50 кап.

Загатоўка бульбы праходзіць больш чым нездавальняюча. Загатоўка лёну выкавана толькі на 3 проц. заданьня. Апрача вышэйпаказаных прычын—тут адыгрываюць ролю і іншыя прычыны, як напрыклад—вялікая колькасьць бульбы спажывае само сялянства, неўрэгуляванасьць спачатку рынку, недастатковая ўвага саміх загатоўпаў да загатоўкі такой важнай культуры, як бульба.

Загатоўка ільна-валакна праходзіць нармальна—загатавана 54,98 проц. заданьня.

Скурсыравіна загатаўляецца слаба.

Фінансаваньне асноўных загатовак з боку цэнтральных устаноў праходзіць ненармальна і несваечасова. Па лёну, валакну і скурсыравіне крэдытаў зусім няма.

Зараз прымаецца шэраг практычных мерапрыёмстваў, каб забясьпечыць нармальны ход загатовак.

Для гарадоў округі будзе завезены хлеб з іншых мясцовасьцяў. Перад Наркамгандлем пастаўлена пытаньне аб павялічэньні завозу прамтавараў у округу. Акрфа і міліцыі прапанавана ўзмацніць барацьбу з беспатэнтнай скупкай і перапродажам хлеба. Дняпросаюзу і сельсаюзу прапанавана ўзмацніць загатоўку бульбы. Каб забясьпечыць сыравінай канова пабудаваны Талочынскі крахмальны завод—пастаўлена пытаньне перад Наркамгандлем аб павялічэньні тэрыторыі—зоны, у якой мае права рабіць загатоўкі адміністрацыя заводу.

Акрсельсаюзу прапанавана прыняць усе меры да забясьпячэньня поўнасьцю здачы сялянству закантрактаванай бульбы.

Цім.

Беспрацоўе будзе зьменшана.

Ворша, 14-XI. Надыходзіць зімовы пэрыяд. Скарачаецца сэзонная праца. Шмат былых рабочых застаюцца бяз працы. Усім беспрацоўным біржа працы ў зімовы час працы даць ня можа. Але ўсёж у ўмовах Аршаншчыны ёсьць пэрспэктывы даць працу частцы беспрацоўным патрабуючым яе ў першую чаргу. У зімовы пэрыяд патрабуецца 1.500 чалавек рабочых на Асінаўскія торфараспрацоўкі, лесазагатоўкі лесбела, лесзага, акрва, чыгункі і паляўдова мясного камбінату. Гэтыя мерапрыёмствы ў значнай колькасьці скароцяць беспрацоўе.

Біржа працы прымае ўсе меры па дапамозе беспрацоўным. Ня маючы ніякіх сродкаў на існаваньне біржа працы дае дармовыя абеды. Усяго на ільготных умовах беспрацоўныя атрымліваюць штодзенна 100 абедаў. У доме сялініна кожны дзень начуе дармова 10 чалавек беспрацоўных.

Прафэсыянальныя саюзы вусім кепска адносяцца да справы дапамогі біржы працы, да выжыцьця пратэкцыянізму. Часта пралазяць не праз біржы працы несябры саюзу на працу, саюз на гэта не рэагуе і не жадае на месца гэтых пасылаць сапраўды патрабуючых працы сяброў саюзу.

На днях будзе перадана справа пракуратуры аб няправільнай пасылцы на працу саюзамі несябраў саюзу. Дзіцячыя яслі бяз біржы працы узялі на працу—Пятрову не сябра саюзу, менш патрабуючай працы чым іншыя. Каўбасная ЦРК узяла на працу бяз біржы працы прыбіральшчыцу—Фусон і харчэўня ЦРК—Багдановіч. Працакалектыў скурнікаў—Айкіну. Біржа працы, вядома, вядзе з гэткімі зьявішчамі барацьбу. Паўнейшы парадак на біржы працы можа быць устаноўлены пры тэй умове, калі будуць дапамагаць прафарганізацыі, прадпрыёмствы і гаспадарнікі.

Збор сродкаў палітзьняволеным.

Гомель, 15-XI. У акрузе пачаўся збор сродкаў палітзьняволеным. На пленуме МОПР асобныя ячэйкі МОПР'у перачалі прэзыдыуму каля 400 руб. Усяго ўжо сабрана больш чым 2.000 руб. Належыць сабраць каля 10 т. р.

Усе члены МОПР'у прымаюць актыўны ўдзел у зборы сродкаў. Кожная мопраўская ячэйка выказвае ініцыятыву ў стварэньні спрыяючых умоў для больш пасьпяховага збору сродкаў

НАРАДЫ ПА ПЫТАНЬНЯХ УРАДЖАЙНАСЬЦІ.

Бабруйск, 14-XI. Акруговы земельны аддзел на 16 лістапада склікае нараду, прысьвечаную пытаньню падняцьця ўраджайнасьці сельскай гаспадаркі. У нарадзе прымуць удзел прадстаўнікі мясцовых земаддзелаў і аграномы.

СУБОТНІК ДАПАМОГІ ШКОЛЕ.

Гомель, 15-XI. Камсамольцы Нова-Беліцы праводзяць суботнікі ў дапамогу школе. Адбыўся адзін суботнік непасрэдна ў школе. Былі зроблены розныя рамонтныя працы. 17 лістапада ўсе рабочыя лесазаводу «Колтруд» будуць працаваць 2 гадзіны ў дапамогу школе. На фабрыцы «Везувій» адбываюцца цэхавыя сходы рабочых аб наладжаньні суботніка. Рабочыя ахвотна згаджаюцца прымаць удзел у суботніку для патрэбы школы.

ЗА 15-ці РУБЛЁВЫ ПАЙ.

Гомель, 15-XI. У мэтах далейшага разьвіцьця паявога капіталу прэзыдыум Акрвыканкому згадзіўся з пастановай савету Райсаюзу аб пераводзе на 15-ці рублёвы пай спажывецкіх таварыстваў, у якіх унесены пай дасягнуў ужо 8 руб.

Павялічэньне паявога капіталу будзе дапамагаць разьвіцьцю данага спажывецкага таварыства.

КААПЭРАЦЫЯ ПАШЫРАЕ СЕТКУ СВАІХ КРАМ.

Быхаў, 10-XI. З кастрычніка зачынілася 5 крам «поўнага таварыства гандляроў» у Быхаве.

У адказ на гэта каапэрацыя адчыняе, каб ахапіць рынак, свае 2 мясныя і 1 сальную крамы.

Каапэрацыі належыць надалей працягваць працу па лепшым абслугоўваньні спажыўца. Бо іншы раз чакаюць у чарзе гадзіну і больш, каб атрымаць, напрыклад, газы.

У Савеце Народных Камісараў БССР.

Чарговае пасяджэньне Савету Народных Камісараў БССР адбылося 14-га лістапада г. г. пад старшынствам Намесьніка Старшыні СНК тав. Каркліна М. М. На гэтым пасяджэньні былі разгледжаны наступныя пытаньні.

ДЗЕЙНАСЬЦЬ ГОРАЦКАГА РАЙВЫКАНКОМУ.

СНК быў заслухан даклад Старшыні Горацкага Райённага Выканаўчага Камітэту, Аршанскай акругі тав. Жылінка аб дзейнасьці райвыканкому.

Горацкі райён займае плошчу 917 клм., у райёне налічваецца 58200 чалавек насельніцтва. Шчыльнасьць насельніцтва ў райёне даволі вялікая —62 чал. на 1 кв. клм. супроць 49 па акрузе і 39,5 па БССР. Прамысловасьць у райёне слабая і складаецца з дробных прапрыёмстваў, як напрыклад: млыны, жывёлабойня, невялікая электрастанцыя. Асноўныя заняткі насельніцтва—земляробства. Сярэдняя забясьпечанасьць гаспадаркі пахацьцю 6 гкт. і сенажацьцю 1,4 гкт.; сады і гароды займаюць у райёне назначную плошчу. Большасьць сялянства жыве на хутарох. У райёне земляўпарадкавана каля 65 проц. усяе плошчы. За апошнія 2 гады надзелена і данадзелена зямлёю 212 двароў, абрэзана 420 гкт. зямлі ў заможных гаспадарках. У зьвязку з аграрнай перанаселенасьцю ў райёне наглядаецца перасяленьне ў іншыя мясцовасьці. Так, у 1928 г. перасяліласа 212 сямей, з кожным годам заяўкі на перасяленьне павялічваецца. Павялічваецца таксама і здача зямлі ў арэнду, што складала ў 1928 г. каля 820 гкт. У райёне вялікая забалочанасьць зямель, ёсьць 7 мэліярацыйных таварыстваў, адно торпавае таварыства, але ня гледзячы на недахоп дроў і на вялікую забалочанасьць у райёне мэліярацыйныя работы і ў паасобку торпараспрацоўкі праведзены слаба.

Пасеўная плошча ў райёне павялічылася на 4 проц. у параўнаньні з даваенным часам, палепшылася скарыстаньне плошчы і разьмеркаваньне культур: доля збожжавых культур паменшылася з 62,9 проц. да 58,3, а доля бульбы павялічылася з 7,3 проц. да 9,3 проц. і доля лёну з 2,5 проц. да 3,4 проц. усяе пасеўнае плошчы. Забясьпечанасьць рабочаю жывёлаю досыць добрая, у райёне ўсяго 2 пр. гаспадарак бяз коняй.

Лік жывёлы за апошнія 3 гады павялічыўся на 4,5 проц., але лік сьвіньняў не павялічыўся. Што датычыцца калектывізацыі ў райёне, то яна праведзена досыць слаба: у райёне налічваецца 4 калектывы, з якіх стала працуе толькі адзін яўрэйскі калектыў. На шматпольне пераведзена 12 проц. усёй плошчы. Значна дапамагаюць у рабоце райвыканкому ў галіне інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі і агрыкультурнай дапамогі сялянству навуковыя працаўнікі і студэнцтва Беларускай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі ў Горках. У райёне налічваецца 57 школ, у якіх навучаецца 5.307 дзяцей, або 69,7 проц. усіх дзяцей школьнага ўзросту. Няпісьменных у райёне 10 проц. У райёне ёсьць адна больніца на 40 ложкаў і некалькі лекавых пунктаў.

Што датычыцца рэалізацыі дзяржаўных пазык у райёне, то першая пазыка індустрыялізацыі была рэалізавана на 106 проц., пазыка ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі на 91,8 проц. і 2-я пазыка індустрыялізацыі на 139 проц., але слаба праведзена рэалізацыя сярод сялянства. Цяпер райвыканком прыняў меры да ўзмацненьня рэалізацыі гэтай пазыкі сярод сялянства. Па самаабкладаньні налічана 35.774 руб., частка якіх ўжо спагнана і скарыстана; на будаўніцтва шляхоў, становішча якіх у райёне вельмі дрэннае, на рамонт школ, на ахову здароўя і г. д.

У райёне ёсьць 2 сельска-гаспадарчыя крэдытныя т-вы. Процант каапэраваньня сялянскіх двароў дасягнуў 43 проц. на 1-X-28 г. Доля прыватніка ў гандлёвым звароце зьменшылася з 67 да 53 пр. усяго таваразвароту.

Выступаўшыя ў спрэчках адначалі, што райвыканком невыстарчальна зьвяртаў увагі на разьвіцьцё вытворчасьці на апрацоўцы сельска-гаспадарчага сырцу. Магчымасьці для гэтага ў райёне бязмоўна ёсьць. Райвыканком павінен зьвярнуць болш увагі на разьвіцьцё сьвінагадоўлі, бяручы пад увагу, што ў Воршы будуецца мясны камбінат. Райвыканкому трэба таксама зьвярнуць увагу на палепшаньне якасьці земляўпарадкаваньня ў райёне, бо да гэтага часу якасьць земляўпарадкаваньня была нізкая, земляўпарадкаваньне часта праводзілася саматужным спосабом. Слаба ў райёне праводзілася і школьнае будаўніцтва (за ўвесь час пабудавана толькі адна школа) на што таксама РВК павінен зьвярнуць увагу. РВК таксама павінен прыняць меры да большага ўцягненьня навуковых працаўнікоў Акадэміі для дапамогі разьвіцьцю сельскай гаспадаркі ў райёне. Трэба таксама зьвярнуць большую ўвагу на палепшаньне работы каапэрацыі як у райёне, так і ў г. Горках у паасобку, дзе шмат студэнцтва.

Для апрацоўкі рэзалюцыі па дакладу СНК абраў камісію.

СНК АБ ДЗЕЙНАСЬЦІ ГЛУСКАГА МЕСТАЧКОВАГА САВЕТУ.

Адзначаўшы шэраг дасягненьняў і недахопаў у працы Глускага местачковага савету, СНК у сваёй рэзалюцыі па дакладу гэтага савету запрапанаваў у далейшай рабоце не паслабляць увагі па ажыўленьні працы местачковага савету і камісій пры ім, яшчэ больш уцягваць у гэтую працу местачковую беднату для выяўленьня і зьнішчэньня недахопаў у рабоце савету. Местачковы савет павінен разгарнуць працу па арганізацыі прасьцейшых відаў каапэрацыі (малочныя, птушыныя, гародныя, садовыя і іншыя т-вы) а таксама па арганізацыі арцеляў па пераапрацоўцы мясцовага сырцу і па вырабу больш ходкай прадукцыі (цэглянае, чарапічнае, смалакурнае і інш.). Бабруйскаму АВК і Белкустпрамсаюзу даручана не пазьней вясны наступнага году скончыць гаспадарчае земляўпарадкаваньне мястэчка і тэрміново прыняць меры да палепшаньня працы саматужных арцеляй. НК Гандлю і Белкустпрамсаюзу вывучыць пытаньне аб магчымасьці пашырэньня вырабу саломкі. Акрвыканком і местачковы савет павінны зьвярнуць увагу на скончэньне земляўпарадкаваньня ў мястэчку і на разгортваньне інтэнсіўнай сельскай гаспадаркі ў мястэчку.

ПЛЯН САЦЫЯЛЬНАГА СТРАХАВАНЬНЯ НА 1928-29 ГОД.

СНК зацьвердзіў плян і бюджэт сацыяльнага страхаваньня на 1928-29 г. Плянам сацыяльнага страхаваньня на 1928-29 г., у параўнаньні з мінулым годам, прадугледжана далейшы рост сацыяльнага страхаваньня, як колькасны, так і якасны. Так, лік застрахаваных павялічваецца на 20 проц., сярэдняя зарплата іх на 6 проц. Агульны лік застрахаваных будзе складаць 96 проц. усіх працуючых па найму супроць 92,2 проц. у 1927-28 годзе. Павялічваецца з 400 да 8000 застрахаваных, якія заняты ў сялянскіх гаспадарках (батракоў). Пашыраюцца ўсе віды дапамогі застрахаваным. Лік забясьпечваемых пэнсіяй павялічваецца з 12.407 да 16.643.

Беспрацоўных, якія забясьпечваюцца дапамогай павялічыцца з 13.744 да 15.218, будзе прапушчана праз дамы адпачынку і праз санаторыі да 10.117 чал., лік інвалідаў у інвалідных домах—з 65 да 90 чалавек. Плянам мяркуецца ахапіць пэнсіяй 500 састарэлых рабочых. Будзе праводзіцца далейшае спрашчэньне страхавога абслугоўваньня працоўных праз арганізацыі выдачы ім пэнсіі і дапамогі на прадпрыёмствах і дома. Сярэдні разьмер забясьпечаньня інвалідаў і іх сем'яў таксама дапамога беспрацоўным некалькі павялічваецца. Па прафілактычнай дапамозе плянам прадугледжваецца правесьці наступнае: мяркуецца пабудаваць 2 дамы адпачынку ў Гомелі і ў Барысаве, накіроўваць у санаторыю Сасноўка па 75 чал., закупіць 227 курортных месц для хворых прапусьціць праз летнія дамы адпачынку 8100 чал., праз зімнія дамы адпачынку—1000 чал.

У адпаведнасьці з плянам сацыяльнага страхаваньня на 1928-29 год разьлік сродкаў прынят па прыбытках у суме—18396800 руб., па выдатках у суме—18847800 руб. з дэфіцытам у 451 тыс. руб.

НК Працы даручана не пазьней 1-га студзеня 1929 г. цалкам перайсьці на выплату дапамогі застрахаваным па часовай непрацаздольнасьці непасрэдна на тых прадпрыёмствах, дзе ёсьць больш 50 чал. рабочых, а таксама дастаўляць дадатковыя віды дапамогі інвалідам і іх сем'ям праз пошту на дом. Галоўсацстраху разам з ЦСПСБ даручана распрацаваць пытаньне аб пашырэньні сацыяльнага страхаваньня на пераменны склад працалектыўаў.

АБ АБАВЯЗКАХ ГАРАДОЎ МЕЦЬ ПЛЯНЫ І ПРАЭКТЫ ПЛЯНІРОЎКІ.

Каб упарадкаваць дабрабыт і жылішчнае будаўніцтва ў гарадох і мястэчках, а таксама каб папярэджваць няправільныя забудоўкі, што выклікае немэтазгодныя выдаткі на ўпарадкаваньне, Савет Народных Камісараў пастанавіў, што гарады: Менск, Віцебск, Гомель, Бабруйск і Ворша павінны мець належным парадкам складзеныя і зацьверджаныя пляны існуючага і разьмяшчэньня сядзібнай часткі і праекты плянірОўкі, а таксама праэкты далейшага разьвіцьця і пашырэньня данага гораду. Іншыя акруговыя гарады павінны гэтым заняцца з наступнага году. Што датычыцца плянірОўкі мястэчак БССР, то гэтае пытаньне будзе разглядацца пры разглядзе пляну ўпарадкаваньня мястэчак.

КУЛАЧЧО ПАДНІМАЕ ГАЛАВУ.

Над падпальшчыкамі і забойцамі трэба наладзіць паказальныя судовыя працэсы.

(Ад нашага карэспандэнта).

Адпаведна з узмацненьнем калектыўнага будаўніцтва на вёсцы расьце і супроць дзеяньне кулака. Кулаччо перайшло да сапраўднага тэрору.

Вось факты па Журавіцкім райёне.

У вёсцы Зімніцах уначы на 4 лістапада ўтвораны ўзброены напад на старшыню сельсавету, але няўдала. Вядзецца сьледзтва, у тых-жа Зімніцах падпалена гумно са збожжам сэкратара сельсавету, які праводзіў у сваёй працы правільную клясавую лінію.

Два стрэлы паслалі кулакі ў вакно арганізатара с-г. арцелі т. Мамчанка ў вёсцы Балотні. Але —міма. У той-жа вёсцы спалілі двор ініцыятара земляўпарадкаваньня і арганізатара калгасу т. Бозікава.

У вёсцы Рэкце забіты 2 коняй камсамольца Напрэева. Апошні быў ініцыятарам земляўпарадкаваньня і правядзеньня самаабкладаньня.

У вёсцы Доўск з'арганізавалася с-г. арцель, дык багатыры (началі пагражаць і расклейваць «праклямацыі», што ўся вёска падмецца полымем, калі калгас будзе сапраўды створан.

У Абідавічах пагражалі забойствам каморніку-земляўпарадкавальніку.

На кулацкі тэрор трэба адказаць.

Беднота, калектывісты павінны яшчэ шчыльней згуртавацца, яшчэ мацней весьці сваю лінію па сацыялістычнай перабудове вёскі. Пад кіраўніцтвам партячэйкі, у згодзе з камітэтам узаемадапамогі, пад падтрыманьнем сельсавету. Усе гэтыя арганізацыі мусяць усямерна дапамагаць беднаце.

З другого боку, трэба моцна ўдарыць на злачынный лапе кулачча. Няхай пралетарская ўлада належным чынам адкажа на кулацкія выбрыкі. Патрэбны паказальныя судовыя працэсы на месцы, у вёсцы.

Кім.

Магілеўшчына.

ПЧАЛА-ДАПАМОЖНІК УРАДЖАЮ

Магілеў, 9-XI. Мясцовым акруговым спэцыялістам па пчалярству М. І. Дамарацкім праводзяцца пры навучальна-паказальнай пасецы цікавыя досьледы над пчоламі абхаскай (каўкаскай) пароды.

Гэтыя досьледы цікавы з двух бакоў.

Папершае, яны паказваюць, што пчолы-каўказянкі на шмат болей прыбытковыя за мясцовых пчол.

Па-другое, пчолы каўкаскае пароды, калі яны ў нас распаўсюдзяцца, будуць мець значэньне дзеля культуры чырвонае канюшыны. Як вядома, апылкаваньне чырвонае канюшыны робіцца праз шмялёў, алеж-ж шмялі ў нас усё зьнішчаюцца і гэта прыводзіць да бясплодзьдзя канюшыны, і вось якраз каўкаская пчала, маючая хабаток даўжэйшы, чымся наша звычайная пчала, можа замяніць шмялёў у апладатварэньні.

Вось што паказалі досьледы.

Пчаліная матка абхаскай пароды была пасаджана ў сям'ю пчол мясцовай пароды ў лінеі мінулага году. У верасьні заместа чорных пчол мясцовай пароды зьявіліся шэрыя са сьветла-жоўтымі кольцамі каўказянкі. Да канца лета яны ў сваім разьвіцьці абагналі сем'і мясцовай пароды.

Ня гледзячы на сваё паўднёвае паходжэньне, каўказянкі аказаліся здольнымі працаваць пры больш нізкай тэмпэратуры, чымся пчолы мясцовай пароды. Наогул, яны адзначаліся працавітасьцю, вострым абаняньнем, плодавітасьцю і ройкасьцю.

У той час, як пры сёлетнім неспагадлівым надвор'і мясцовыя сям'і пчол далі каля 2-3 рублёў прыбытку, сем'я каўказянак прынесла рой-пярвак весам у 2 кілёграмы і 20 кілёграмаў мёду, разам на суму каля 20 рублёў.

У наступным годзе мяркуецца адкрыць пры акруговым земаддзеле выхавальнік племянных матак каўкаскай пароды для распаўсюджваньня іх сярод насельніцтва.

Варта, каб гэтаю справаю заняліся таксама нашы пчалярныя каапэрацыйныя таварыствы, калгасы і саўгасы.

К—к.

ЗАЎВАГІ К ЧАСУ.

У апошні час адмячаецца вострая зацікаўленасьць справаю разьвіцьця беларускага тэатру, беларускага кіно, беларускай музыкі. Шэраг артыкулаў на гэтыя тэмы зьявілася ў нашых газэтах, праведзена некалькі дыспутаў. Паўсталі ажыўленыя гутаркі сярод пісьменьніцкіх і тэатральных колаў. Да іх пачынаюць далучацца гледачы тэатру, ведамствы, што маюць дачыненьні да культурнага будаўніцтва, нарэшце, гушчы савецкага грамадзянства, так ці іначай зьвязанага з адмечанымі галінамі беларускага мастацтва.

Гэта—цікавае зьявішча; яно сьведчыць нам пра дадатныя моманты ў справе будаўніцтва беларускае культуры. Гэта нам кажа пра тую сувязь, якую павінна пашырацъ і паглыбляць беларуская культура з шырокімі колямі нашага грамадзтва. Там, дзе гэтага няма, ня можа быць і здаровых задаткаў творчасьці. Закінутасьць—пагражае запінаданьнем, таўкатнёю на адным месцы, умраньнем. Мастацтва не павінна замыкацца ў самое сябе—тады яно пустая рэч. Нельга ўнікаць адчыненых вачэй грамады, нельга стараніцца яе здаровае, зьместнае крытыкі. Калі гэта ёсьць, знача, аб'ект увагі набывае важкасьці і каштоўнасьці.

Накіраваная на яго ўвага мае заданьнем гэту важкасьць і каштоўнасьць напоўніць.

Так стаіць справа з беларускім тэатрам, з Белдзяржкіно і інш.

Яшчэ памятны час, калі Белдзяржкіно мела выключна функцыі пракату фільмаў Савкіно, Грузінкіно, ра... Далей жыцьцё змусіла Белдзяржкіно пачаць сваю ўласную вытворчасьць. І вось, сталі фармавацца фільмы—«Прастытутка», „Такова наша Беларусь" і інш. На гэта была зьвернута належная ўвага друку, савецкай грамадзкасьці. Белдзяржкіно павінна перастаць быць пракатнай канторай, а мусіць прыняць на сябе ролю вытворчай установы—першае. Другое—вытворчасьць яго не павінна цурацца беларускага жыцьця. На тое яно і Белдзяржкіно, каб адбіць на плёнцы разнастайныя праявы беларускага мінулага і беларускай сучаснасьці. З натугамі ды з агрыманьнем дакаціліся да «Лясное былі» і да „Кастуся Каліноўскага". Гэтыя два фільмы—як творчасьць беларускае працоўнае культуры, зарэкамэндавалі сябе непараўнаўча больш праславутае „Простытуткі". Белдзяржкіно з імі вышла ў людзі. «Кастуся Каліноўскага», думаецца, з ахвотаю паглядзелі і тыя асобы з дзяржпляну, якія компэтэнтна ў свой час выносілі пастанову пра непатрэбу зрабіць гэты фільм. Не ашукалася ў „Кастусю Каліноўскім" і Белдзяржкіно. Наадварот, яно з бадзёрасьцю паглядзела наперад і ў бягучым годзе абвесьціла больш-менш шырокі пэрспэктыўны плян свае вытворчасьці на бліжэйшы час. Па памеру пляну—чакаць большага нельга. Як-ні-як, а кіно пакуль што ў нас не прывыклі лічыць за культурную ўстанову. За выключэньнем малога ліку людзей, на Белдзяржкіно глядзаць, як на вузка-гаспадарчы [illegible] часамі, па[illegible]фінаўскім [illegible] разьбі[illegible]—ня-моцкая ці беларуская, але—раз ідзе—плацi падаткі. Магчыма, так і трэба, толькі далёка не ня трэба даць Белдзяржкіно субсыдыю ці павыку. Між тым з мукамі ўдалося гэтым летам маленькую павыку зрабіць. Як бачым, сродкі дастаюцца цяжка, іх у Белдзяржкіно няма на намечаны плян—дарэмна сьцьвярджае адваротнае культаддзел Дзяржпляну!

А калі туга са сродкамі, то іх і распушчаць трэба з асьцярогаю. Гэтак думае М. Зарэцкі, які правільна і дасьціпна разабраў праэкт вытворчага пляну Белдзяржкіно, абвешчанага ў газэтах. Можна плян абараняць, можна яго растлумачваць, але не згадзіцца з яго ніякаватасьцю нельга. Бязумоўна, што належныя органы, празякія павінен плян прайсьці, сунеюць падысьці да яго крытычна. Усё-ж папярэджаньні патрэбны—надзейнай прафілактыка, ніж лячэньне. М. Зарэцкі трапна ківае пальцам на адсутнасьць у пляне патрэбнага ліку тэмаў з беларускага жыцьця. М. Зарэцкі правільна паказвае і на іншыя недахопы пляну. М. Зарэцкі хоча, каб сродкі аднавядалі мэтам.

А вось, чаго-ж хоча Т. Глыбоцкі? запытаецце вы, калі перанясецеся ад Белдзяржкіно да першага беларускага тэатру. Бач, гэты крытык, дададуць іншыя, занадта стаў неспагадным у адносінах да БДТ 1. Ён, бачыце, цалкам нездаволены яго працаю, напрамкам гэтае працы, падыходам тэатру да выбару тэм.

Началося ад „Пяюць верацёны», а далей чапіла «Бронецягнік» і разрасла ўглыбкі ды ўшыркі. Нам здаецца, што ў Т. Глыбоцкага думкі блівкія і роўныя думкам М. Зарэцкага. Пастаноўка пытаньня—тая самая. Першы беларускі тэатр ня можа і не павінен выходзіць з поля крытычнага абстрэлу згодна выказаных намі вышэй меркаваньняў. Гэта рэч абавязковая і карысная. Між тым, леташні год тэатру аставаўся ў баку ад належнага за ім нагляданьня. І калі ён апынуўся зноў у Менску, то было-б бядою, каб пра яго не пагутарыць. Год працы—гэта ня пусты гук! У нашу пару гадовы адрэзак часу—цэлы пэрыяд. Што-ж ён унёс у зьмест працы беларускага першага тэатру? Вось пытаньне, якое паставіў перад сабою Т. Глыбоцкі і на якое дае адказы ў сваім сур'ёзным, грунтоўным артыкуле «Давоі анэкдотаў». Тав. Глыбоцкі выяўляе шэраг недахопаў у працы тэатру і заключае, што тэатр перажывае зараз крызіс. Магчыма, што гэта і завостра выведзена, тым ня менеі тут ёсьць значная доля праўды.

На першы беларускі тэатр мы глядзімо, як на тэатр, якому трэба ў нашых умовах мець маленькую здольнасьць жанравай эквілібрыстыкі, Яго глядач — занадта разнастайны. І ад гэтага — яго рэпэртуар-вінігрэтны. Тут маюцца і камэдыя, і трагэдыя, і драма, і дробныя п'ескі. Дзякуючы гэтаму, тэатр ня мае твару. Ахарактарызаваць яго цяжка, калі немагчыма зусім.

За пытаньнем пра гледача стаіць пытаньне грашовае. Тэатр пастаўлены ў дзесьць бюджэтныя рамкі, выйсьці з якіх—бяда для тэатру. Кіраўніцтва тэатрам мусіць усю энэргію траціць на адшуканьне магчымасьці канчаць сэзоны бездэфіцытна, у рамках бюджэту. Гэта вельмі балюча адбіваецца на творчым жыцьці тэатру. Досыць успомніць факт спазьненьня з сэзонам бягучага году, каб уявіць сабе нервовасьць прыўнесеную ім у працу тэатру. Яшчэ і дагэтуль некаторыя людзі, на абавязку якіх ляжыць дапамагаць тэатру ў яго працы, на ўсе лады і манеры складаюць і будзіруюць пытаньне з запазьнень

Праверка--самакрытыка--кантроль мас.

ЮБІЛЕЙ СЯМІГАДОВАЕ ВАЛАКІТЫ.

ЛЁКАЙ ПАНА ПАКЛЕЎСКАГА.

Далёка ў Полацкай акрузе, у Верхнеднепрскім раёне, у маёнтку Быкоўшчына да Кастрычнікавае рэвалюцыі жыў пан Паклеўскі. Жыцьцё яго праходзіла весела, спакойна і мірна. Сяміне ад золаку да золаку гнулі свае хрыбіны, працуючы ў маёнтку, клапаціліся аб пане, а ён пахмура насупіваў брыва і стараўся ўсім цяжарам сёньці на шыю сялян, маючы ад гэтага вялікія грашовыя і натуральныя прыбыткі.

У выніку „ўмелае" працы пана Паклеўскі адчыняў на Ўрале фабрыкі і купляў шмат вялікіх маёнткаў.

Апрача Быкоўшчыны, пан Паклеўскі з «божаю дапамогаю» пабудаваў ругі такі-ж самы маёнтак у м. Каноўшчыне, Ветрынскага раёну, Полацкае акругі.

У самы разгар «будаўніцтва» пана Паклеўскага ў маёнтку Быкаўшчыне прыстроіўся нейкі гр-н Рэйшэль, кар'ера якога перавышае амэрыканскую фантасьць і німецкую зручнасьць. Лёгкай Рэйшэль заваяваў такое вялікае довер'е ў пана Паклеўскага, што апошні падараваў яму свой маёнтак Каноўшчыну, у якім знаходзілася 126 гектараў зямлі, некалькі дзесяткаў гасканалых будынкаў, 2-хдзесяцівны сад і інш. Паклеўскі-ж сам пераважна знаходзіўся на Ўрале, але прыяжджаў у Каноўшчыну на адпачынак.

Атрыманы маёнтак Рэйшэль перадаў свайму зяцю Чарновічу, які фактычна і быў гаспадаром гэтага маёнтку.

Выбухнула Кастрычнікавая рэвалюцыя. Прадмесьце занялі белапалякі, але надышлі чырвоныя атрады, і палякі пакінулі занятыя пазіцыі.

Бачачы блізвыхаднае становішча, фактычны гаспадар маёнтку Каноўшчына Чарновіч кінуў свой маёнтак і выехаў супольна з белапалякамі ў Польшчу, дзе пражывае і ў сучасны момант. Тое-ж самае зрабіў і пан Паклеўскі, але ён пакінуў яшчэ некаторую маемасьць свайму «лёкаю» Рэйшэлю.

У 1922 годзе абшарнік Рэйшэль быў узяты ў якасьці заложніка. На падставе гэтага ўсе пабудовы былі узяты на вучот і перададзены гаспадарчым органам.

У 1925 г. Ветрынскі райвыканком усе пабудовы маёнтку Каноўшчына (апрача прыгожага дому), перадаў заставшымся ў маёнтку беднякам і батракам. Тое-ж самае было зроблена і з зямлёю. Прыгожы дом быў пакінуты для мясцовае школы, але з прычыны яго адлегласьці ад насельніцтва, дом ня быў выкарыстан для памянёнае мэты.

Хутка абшарнік Рэйшэль вярнуўся з заложнікаў і прыехаў у маёнтак Каноўшчыну. У маёнтак таксама прыехала дачка Рэйшэля, якая хутка выйшла замуж за гр-на Шукевіча.

АБШАРНІК РЭЙШЭЛЬ ДАБІВАЕЦЦА СВАІХ „ПРАВОЎ".

У 1923 годзе абшарнік Рэйшэль падаў заяву ў нарсуд, каб за ім прызналі працоўнае карыстаньне маёнткам. Нарсуд у просьбе Рэйшэлю адмовіў і прызнаў канфіскацыю маёнтку правільнай.

«Пакрыўджаны» абскардзіў паўторна ў Віцебскі акруговы суд, але апошні таксама адмовіў. Рэйшэль трэці раз падаў скаргу ў акруговую зямельную камісію, якая таксама адмовіла ў яго просьбе.

У 1928 годзе Ветрынскі райвыканком ухваліў пастанову: прадаць дом абшарніка Рэйшэля і К-о Ветрынскаму спажывецкаму таварыству для пабудовы ў м. Ветрына цэнтральнае райённае сталоўкі, якая-б абслужыла некалькі сот чалавек. Так было і зроблена. Вялізны будынак быў прызначан для сталоўкі.

Ветрынская кааперацыя пасылае некалькі дзесяткаў рабочых для разборкі дому. Але Рэйшэль і К° затрымалі разборку дому, каб замацаваць яго за сабою. Хутка яны пасхалі ў райвыканком з просьбаю адкласьці іх высяленьне з маёнтку Каноўшчына. У просьбе было адмоўлена. Яны накіраваліся ў Полацкі акруговы выканаўчы камітэт, які таксама ў просьбе адмовіў і запрапанаваў выселіць іх у тыднёвы тэрмін.

Не задаволіўшыся гэтай пастановай, Рэйшэль паехаў у Прыёмную ЦВК БССР, дзе была накладзена рэзалюцыя: «Выслаць справу пракурору Рэспублікі». Апошні піша полацкаму пракурору аб тым, каб высяленьне Рэйшэля прыпыніць і разгледзець справу па сутнасьці. Полацкі пракурор разгледзеў справу ў двухтыднёвы тэрмін і паведаміў Ветрынскаму райвыканкому, што «справа аб высяленьні абшарніка Рэйшэля выяснілася і можна распачынаць карыстаньне маёнткам Каноўшчына».

Дачакаліся, уздыхнулі таварышы з Ветрынскага райвыканкому.

Кааперацыя другі раз пасылае рабочых для разборкі дому. Але Рэйшэль рабочых прагнаў, пагражаючы, што „калі пачнеце ламаць, заб'ю". Пасьля гэтага Рэйшэль хуткім цягніком паехаў у Менск у Наркамюст і даў тэрміновую тэлеграму: «Прыпыніць разбор дому і справу выслаць пракурору Рэспублікі».

ШТО СКАЖА НАРКАМ'ЮСТ БССР?

Такім чынам, абшарнік Рэйшэль і К° свабодна пражываюць у сваім доме, маючы ў сваім карыстаньні 2-х дзесяцінны сад, некалькі кароў, коняй і дзесяціну зямлі.

Гэтай сямігадовай валакітай мясцовыя арганізацыі вельмі абураны і патрабуюць высяленьня абшарніка Рэйшэля.

Пяўжо абшарнік Рэйшэль будзе спакойна пражываць у маёнтку? Хто прыняе высяленьне абшарніка? Ці будуць вінаватыя прыцягнуты да адказнасьці?

Няхай адкажа Наркам'юст БССР.

Сьпір. Міхальцоў.

Там, дзе хаўрус між рэвкамісіяй і праўленьнем.

Барысаўскае сельска-гаспадарчае крэдытнае т-ва, заданьне якога абслугоўваць крэдытамі і іншым выключна бяднякоў і часткова серадняцкія сялянскія гаспадаркі—рабілі ўсё магчымае.

Аказалася, што крэдыт накіроўваўся ня так, як гэта павінна было быць, а галоўным чынам у рукі заможных і кулацкай часткі вёскі і служачым т-ва, якія ніякіх адносін ня мелі да сельскай гаспадаркі.

Вось галярэя асоб, якія карысталіся крэдытамі:

Селавіну Яўўанскаму, маючому 30 дзесяцін зямлі, выдадзена 155 р., уладзьніку млына, у якога ёсьць моцная гаспадарка, Сеньковічу выдадзена 187 руб., Нікіфаровічу П. С. (мае 10 дзесяцін, 6 кароў, 2 коні)—335 руб. 74 кап. і г. д.

Вядома, што гэтыя факты сьведчаць аб адсутнасьці класавай лініі ў разьмеркаваньні крэдытаў. Браў крэдыт выключна кулацкі элемент. Здаецца, крэдыт павінен быў выдавацца для падпаньня выключна сельскай гаспадарцы, але-ж мы бачым, што ён выдаваўся гарадзкому заможному мяшчанству на розныя патрэбы. Выдадзена гр-ну г. Барысава Савіцкаму Юльяну, маючаму вялікія дамы, з якіх ён арэнды зьдзірае да 1.000 руб., 50 руб. на невядомыя патрэбы.

Бралі крэдыт і такія, якія зусім ня маюць зямлі і ніякай гаспадаркі.

Ведома, што «умоўныя» крэдыты выкарыстоўваліся такімі пайтчыкамі на інш. патрэбы.

Цікава адзначыць, што ўсе гэтыя факты рэвкамісіяй зусім ня былі «заўважаны».

А тлумачыцца гэта тым, што старшыня рэвкамісіі т. Тамаровіч Ф. узяў 253 руб. крэдыту, у той час, як ніякай гаспадаркі ня меў. Таксама Бельскі Антон і Ржэўскі, якія на невядомыя патрэбы атрымалі 285 р.

Калі зьвярталася бедната за крэдытам, дык яе валавозілі па розных «фармальнасьцях», і кожная пазыка выдавалася толькі пасьля запісі раскіруўка.

Факт гэты сьведчыць нам аб тым, што ў праўленьня і працаўнікоў няма клясавага падыходу, што інтарэсы кулака для іх даражэй, чым інтарэсы беднаты.

Таксама дрэнна стаіць справа з загатоўчай працай. Прымаўся на працу розны элемент і залічваўся ў штат.

Цікавы факт. Старшыня РВК выпадкова быў на рынку і ўбачыў, што агент Дзяржгандлю Клёнскі Авель купіў грыбы па 2 р. за фунт, у той час, калі лімітныя цэны былі 3 руб. Клёнскі быў зьняты з працы ў Дзяржгандлі за гэтую справу. Гэты самы Клёнскі ў сучасны момант працуе ў таварыстве. У таварыстве ў якасьці скупшчыкаў працуюць: Мінкін Якуб і Рубінштэйн Шмуйла—парушыцелі лімітных цэн, былыя гандляры.

Каждан і Клібаноў, якія выключаны, як дрэнныя працаўнікі з Дзяржгандлю, прыняты на працу, а Стронгін Іцка—кантрабандыст таксама.

Шмат спэкулянтаў бралі авансы ў таварыстве на загатоўку розных рэчаў і ў працяку некалькіх гадоў не зварочвалі.

Так, нейкі Раскіндзе зьвярнуў 300 р., Файн з м. Зембін—200 р., Статкевіч і Баско з Н.-Барысава—100 руб. і не зьвярнулі дагэтуль.

Цікава падкрэсьліць, што старшыня праўленьня Статкевіч зусім дрэнна адносіўся да сваіх абавязкаў.

Фактаў безгаспадарчасьці ў таварыстве ёсьць шмат. Неабходна тэрмінова разгарнізаваць апарат сельска-гаспадарчага таварыства, неабходна праўленьне і рэвкамісію тэрмінова прыцягнуць да адказнасьці за выкарыстоўваньне свайго становішча ў асабістых інтарэсах (атрыманьне крэдытаў і г. д.).

Белсельбанку неабходна прыцягнуць да адказнасьці інструктароў, якія „наскокамі" рэвізавалі т-ва, не інфармавалі РВК аб становішчы таварыства, а маўчалі, лічачы слабе спэцыялістамі ў гэтай галіне.

Неабходна тэрмінова прыцягнуць гр. Статкевіча за нядбайныя адносіны да сакратнай перапіскі і валакіту з затрыманьнем адказу АКК на пераліску за № 128 ад 28-V-28 г., якая ляжала-б далей, калі-б выпадкова старшыня РВК не знайшоў яе ў стале Статкевіча.

Неабходна тэрмінова абсьледаваць асабісты склад працаўнікоў таварыства, бо там ёсьць былыя афіцэры, дзеці ўласьнікаў млыноў, заможныя мяшчане

Гнайнік таварыства неабходна тэрмінова ачысьціць.

Рабкоры С. і И.

Пастанова аб сілясаваньні кармоў засталася на паперы.

У БССР вельмі востра стаіць пытаньне з кармавым балянсам. Наша жывёлаводзтва ўпіраецца ў тупік нястачы кармоў. Не хапае ня толькі канцэнтраваных кармоў, але часамі бракуе самай звычайнай жытняй саломы. Бываюць такія гады, калі пад вясну ні ў клеці, ні ў гумне,—ні каліва. Прыходзіцца зьдзіраць абаншалую, гнілую саламяную страху і рэзаць з яе сечку. Можна сабе ўявіць, які з яе смак, і якою спажыўнасьць яна дае скаціне

Зусім слушна, што пры такіх умовах ні ў якім выпадку нельга палепшыць гатунак нашае скаціны, ні ў якім выпадку нельга арганізаваць моцную малочную гаспадарку.

Тым часам у нас ёсьць усе магчымасьці, так сказаць, хатнім спосабам павялічыць значна кармавы балянс. Мы проста ня ўмеем выкарыстаць тыя вялізныя запасы зялёнага бульбяніку, аціньня гародніны, атаву канюшыны, якая дрэнна сохне ўвосень і часта дарма гніе. Нават сьмяцьцёвыя травы, як гарчак, конскі шчавельнік і інш. пры сілясаваньні даюць узімку зялёны вельмі спажыўны корм.

Што мы зараз маем у вёсцы? У лепшым выпадку бульбянік з большага скошваецца, а потым дагнівае ў азяродах, дзе яны ёсьць, а звычайна ён застаецца на палёх.

Вось што піша аб сілясаваньні супрацоўнік Беларускага Навукова-Дасьледчага Інстытуту Сельскай і Лясной Гаспадаркі С. І. Журык.

... «Як дыетычны корм, зялёная трава грае вялікую ролю. Часта, амаль заўсёды, усе веснавыя страўнікавыя хваробы жывёлы бываюць ад недахопу ці проста кажучы, ад адсутнасьці ўзімку зялёнага корму.

...Ведаючы такое вялізнае значэньне зялёнага корму, траба шырока паставіць пытаньне аб забесьпячэньні гатым кормам жывёлы на працягу ўсяго году, а ня толькі ўлетку. Забясьпечыць жывёлу ўзімку залёным сакавітым кормам з несапсаванымі вітамінамі і страўнай матэрыяй можна толькі праз сілясаваньне сакавітых кармоў...

Асабліва важнае значэньне набывае халоднае сілясаваньне для Беларусі. Яе досыць вільготны клімат дазваляе вырашчваць багатую расьлінную масу, але не дае мажлівасьці падрыхтоўваць добрае сена. Асабліва гэта адчуваецца ў тыя часы, калі ідуць нясьціхаючыя дажджы.

Лепшыя эўрапейскія вучоныя-жывёлаводы і гаспадары бачаць у сілясаваньні выхад з таго цяжкага становішча, у якім яны апынуліся, дзякуючы скарачэньню ўвозу ў гэтыя краіны сакавітых макухі. Яны ў сілясаваньні бачаць магчымасьць яшчэ напалавіну скараціць увоз да сябе іншакраёвых бялковых кармоў, замяніўшы іх сілясамі.

У пратаколе пасяджэньня калегіі Наркамзему за № 23, ад 21-га кастрычніка 1927 г., у п. 6 мы знаходзім такую пастанову:

Прымаючы пад увагу вялікі недахоп кармоў для жывёлаводзтва, асабліва ў зімовы пэрыяд, пачаць папулярызацыю сярод сялянства сілясаваных кармаў.

Ад гэтага гістарычнага ў справе закладкі сілясаваньня ў БССР пасяджэньня прайшло ўжо больш году, прайшла і восень, у працягу якой можна было-б захаваць на зіму ў выглядзе сілясу вялікую масу бульбяніку, бурачнага аціньня і інш.

Нашы саўгасы і калгасы маглі-б прарабіць вельмі вялікую работу ў справе захаваньня значнага кармавога балянсу. Гледзячы на іх, пацягнулася-б і сялянства,—гэта асноўная маса нашых гаспадарак, якія амаль штогод церпяць ад бяскормiцы. Калі ня мыляемся, то на гэта мерапрыёмства былі асигнаваны даволі буйныя грошы. Але... прыгожыя словы і пажаданьні само сабой, а справа—само сабой:

— Мы можам сказаць, што ні Белсельтрэст і Белсельсаюз нічога не зрабілі ў справе папулярызацыі сілясу, і пастанова калегіі НКЗ так і засталася не праведзенай у жыцьцё.

Так у папяровых нетрах захлынуліся добрыя пажаданьні.

А селянін ізноў налезе на старую страху і выцягне з папледзін жменю гнілой саломы, каб хоць на часіну спыніць рыканьне галоднай скаціны.

С.-Г. АРЦЕЛЬ „КАСТРЫЧНІК".

За паўвярсты ад мястэчка Парычы паабапал дарогі раскінуліся роўныя абшары зямлі без межаў.

Улева—к рацэ Бярэзіне—50 гэктараў сенажаці, управа—50 гэкт. пахаці. Бліжэй к мястэчку ў ліпавых прысадах схаваўся фруктовы сад, побач прыстроіліся розныя будынкі. Далей на ўзгорку прымасьцілася двохнавярховая будыніна з невялічкай трубой.

Гэта б. маёнтак Пушча, зараз яўрэйская сельска-гаспадарчая арцель «Кастрычнік».

Як арганізавалася арцель?

У 26 годзе 12 сямей яўрэйскай местачковай і вясковай бедноты зышліся пад страхой былога маёнтку Пушча і рашылі пачаць калектыўную працу

— Як жыць, што рабіць,—самі ня ведалі, кажуць цяпер калектывісты.

— Цяжка было, так цяжка, што і ўспамінаць ня хочацца.

Што мелі арцельцы?

9 кароў, 5 коняй і 60 едакоў. Вось і ўсё. Ні інвэнтара, ні запасаў збожжа, мелі толькі працоўную сілу.

І вось тут калектывісты, ня маючы нічога за душой, рашылі пачаць вялікую справу—пабудаваць крахмальны завод. Гэта рашэньне так бы і засталося рашэньнем, бо сродкаў у арцелі, канешне, ня было ніякіх. Але тут дзяржава шырока пайшла на спатканьне жаданьню арцельцаў. Пабудова заводу ў райёне, багатым бульбай, прызнана была рацыянальнай. Арцелі адпусьцілі крэдыт, склалі каштарыс на 12 тыс. і пабудова пачалася.

Горача ўзяліся арцельцы за працу, не шкадавалі сілы. У пабудову заводу яны ўклалі сваёй рабочай і гужавой сілы на 2300 руб.

Але было цяжка. Каштарыс па пабудову заводу аказаўся ў два разы меншым. Сродкаў ня было, прыходзілася іх дабываць з вялікімі труднасьцямі. Але арцельцы не здаваліся.

— Паверце, елі адзін шчавель, хлеба ня было,—апавядае Бэрка Ігольнік —У мяне вось тут, паказаў Ігольнік на пераносіцу, забалела ад голаду.

Хлеба свайго арцель ня мела, толькі поле абсеялі, грошы ня было і адно што іх карміла—гэта невялічкая саматужная маслабойка, якую мелі калектыўцы.

— Каб не дзяржава, дык бы нічога не зрабілі, дзяржава дапамагла.

Дзяржава адпусьціла дадатковы крэдыт да 23 тысяч і пабудова заводу праз год была скончана. Вялікая ўрачыстасьць была ў арцельцаў, калі пускалі ў ход сваю крахмальню, пабудаваную з такім напружаньнем сіл і энэргіі.

Запрацаваў завод і запрацаваў досыць добра. У першы-ж год завод даў 10 тысяч прыбытку. Завод перарабіле зараз 40 тыс. пуд. бульбы ў год, але перапрацоўку можна давесьці да 80 тыс. пудоў. Малая сушылка не дазваляе павялічыць выраб. На пашырэньне сушылкі патрэбна 7 тысяч рублёў, але калектыўцы ня хочуць залазіць у вялікія крэдыты і пакуль што ўстрымліваюцца ад пашырэньня. Завод апальваецца зараз торфам, які арцельцы самі капаюць на сваім полі. Летась завод меў наёмнага мэханіка, а сёлета абыходзіцца без яго. Бэрка Ігольнік, адзін з арганізатараў арцелі, цяпер намесьнік старшыні, сам спраўляецца за тэхніка.

— Прыгледзіўся як той рабіў і падвучыўся крыху, скромна зазначае ён.

Бэрка Ігольнік «крыху падвучыўся», відаць таму, што ён закаханы ў свой завод. Калі ён вадзіў мяне па заводу і падрабязна тлумачыў увесь працес вырабу крахмалу, адчувалася гэта яго ўлюбёнасьць у кажную дэталь заводу.

Крахмальны завод—гонар арцелі. Ён пабудован саміні арцельцамі, ён дае прыбытак, дае добры выраб, які мае добры збыт.

Справіліся арцельцы і з сельскай гаспадаркай. Зямля іх зараз разьбіта на 8 палёў, 6 гэктараў саду агледжаны, даюць добры ўраджай. Маюць зараз арцельцы 40 дойных кароў, 16 маладняка заваднога быка, 9 коняй. Маюць усе патрэбныя с.-г. машыны і прылады. Сельскую гаспадарку яны прыстасоўваюць к патрэбам заводу. На лета мяркуюць засеяць каля паловы усёй зямлі бульбай.

— Будзе свая сыравіна для заводу.

Што можна сказаць аб жыцьці і працы арцельцаў?

Аб гэтым красамоўна кажуць самі арцельцы.

— А што нам цяпер? Працы хватае,—больш нам нічога і ня трэба. Жывём добра.

І праўда, арцельцы жывуць добра. Забясьпечаны ўсе кватэрамі, кватэры прасторныя, сьветлыя. Атрымлівае дарэсны работнік 40 руб. у месяц, харчы купляюць большасцю ў арцелі па таннай цане. Сямейныя таксама не пакрыўджаны. Дзеці ад 1 да 7 год атрымліваюць 3 руб. у месяц, ад 7 да 12—5 руб. і ад 12 да 18 год—7 р. Пасьля 18 год моладзь уносе пай і ўступае ў арцель з правам сталага члена арцелі.

Вялікая ўвага зьвернута ў арцелі на дзяцей. Летам у арцелі працавалі дзіцячыя яслі, а з восені рашылі арганізаваць сталы дзіцячы сад.

— Няхай тысячу, няхай дзьве будзе каштаваць нам гэты сад, але адчынім. Дзеці нашы ня так павінны гадавацца, як мы гадаваліся.

Аб аўтарытэтнасьці арцелі, аб яе жыцьцядольнасьці яскрава сьведчыць тая цяга ў арцель, якая выявілася ў апошні год сярод местачковага і ваколічнага вясковага яўрэйскага насельніцтва. За апошнія месяцы ў арцель паступіла 40 заяў ад яўрэйскага насельніцтва, якія жадаюць уступіць у сябры арцелі. З гэтых 40 жадаючых арцель прыняла толькі 4-ох і зараз арцель налічвае 14 сямей і звыш 70 едакоў.

— Два гады таму назад, кажуць арцельцы, мы чуць сабралі 12 сямей, а цяпер во як хочуць да нас.

Чым-жа тлумачыцца такая цяга ў арцель? А вельмі проста.

— Жывуць добра і працуюць весела.

Гэта ўсё зрабіла калектыўная праца. Добрае жыцьцё, вясёлую працу даў калектыў.

Парыцкая «Пушча», быўшая калісь запраўды пушчай, дзе ў ліповых прысадах запыўся адзін павук-абшарнік —зараз ажыла.

Калектыўная праца напоўніла прысады новымі, сьвежымі галасамі, бадзёрымі галасамі вольнае працы.

Спакойнае ўзьбярэжжа краёуні-Бярозы, устрывожыў новы гук—гук заводкай трубы.

Л. Савёнак.

Новы пан.

(Бярэзінскі раён, Менскай акр.)

У вёсцы Янава, Бярэзінскага с.-с. і раёну, жыве кулак Шусьценка Паўла. У 1926 годзе ён прыстаў у прымы да гр. Асіеўскай, у якой лічылася 30 дзесяцін зямлі з іх 6,5 дзесяцін пад лесам, а рэшта—удобная для засеву. Гаспадарка Асіеўскай была абрэзана. Шусьценка пачаў хадайнічаць аб тым, каб гэту зямлю вярнуць назад. Мясцовая ўлада адмовіла, бо знала кулацкую хітрасьць Шусьценкі. Але Шусьценка пад'ехаў к быўшаму загадчыку земчасткай Бярэзінскага РВК т. Бараноўскаму, і зямлю зноў аддалі яму.

Цяпер Шусьценка красуецца. Усіх беднякоў называе «мужычком». Гаспадарка яго не разьдзелена. Ды яшчэ ўдабавак узяў у арэнду зямлю гр. Сташэўскай 10 дзесяцін з мэтай не дапушчэньня беднаты ў гэтую кулацкую ваколіцу. І жыве сабе Шусьценка прыпяваючы. Ды і чаму-ж яму ня жыць. Сваёй зямлі ўдобнай—23,5 дзесяціны і 10 дзесяцін арандаванай, а ўсёй сям'і—4 душы.

С.-г. падатак плаціць асобна, а жыве разам. Гаспадаркай кіруе Шусьценка.

Сям'я адна, але хітрасьць кулацкая і тут знайшла выхад, каб менш плаціць падатку. Адчуваючы сябе поўным уладаром сваёй мясцовасьці, ён самавольна высек шмат дрэў у лесе мясцовага значэньня в. Паложына. Парубка была вынулена, і адпаведныя органы Бярэзінскага райёну палажылі штраф у суме 167 рублёў. Але Шусьценка падаў заяву у ЦВЕ аб выкаленьні яго ад штрафу.

Бедната абурана гэткім здарэньнем, бо лес Шусьценку не патрэбен.

РСІ, загляні ў Бярэзінскі райён і дапамажы зьбіць рогі Шусьценку.

Мясцовы.

„Да выданьня новага закону".

„А судзьдзі хто?"...

Гэты сказ ад нашых часоў аддзяляецца сотнямі гадоў. Але гэта нічога. Такое пытаньне можа задань (і будзе слушна) любы супрацоўнік ВСНГБ. Зразумела, мы не гаворым тут пра тав. Лучыцына—ён такога пытаньня не задасьць, бо ён сам «судзьдзя».

«Судзьдзя» яшчэ і тав. Гельфэр. Апошні —прадстаўнік рабочай часткі.

Ну, і РКК склалася ў ВСНГБ! І як яна толькі да пераняцьбараў дажыве?

Калі хто падумае, што мы пра РКК з ВСНГБ пішам няпраўду, дык няхай паслухае факт. Вось ён:

Захваралі—фурман тав. Багданаў і машыністка тав. Бацьвіньнік. У гэтым нічога дрэннага. Ці мала людзі хварэюць?

Пасьля іх хваробы адміністрацыя ВСНГБ рашыла, што трэба ім не дадаць 4 р. 52 к.

Для адміністрацыі гэта ня сума, а для машыністкі і фурмана—гэта грошы. Яны і пасвардзіліся ў РКК.

Заяву падалі ў маі, а РКК дабралася да яе 13 чэрвеня. Гэта замест 24 гадзін, якія па закону дапушчаюцца.

І вось пры разборы скаргі прадстаўнік рабочай часткі Гельфэр уносіць прапанову:

„Пытаньне палінуць адчыненым".

Так і ў пратаколе зазначана. А матывам для гэтага Гельфэру паслужыла тое, што па гэтым пытаньні мае быць выданы новы закон.

Сядзіце, т. т. Багданаў і Бацьвіньнік і чакайце, пакуль будзе выдан новы закон.

Гэта абурачая пастанова „рабочага судзьдзі" Гельфэра выклікала сярод супрацоўнікаў ВСНГБ хвалю нездавольненьня. Напісалі заметку ў насьценную газэту. Гэта спужала „судзьдзю" і ён склікаў паўторнае пасяджэньне РКК б кастрычніка.

І вось толькі пасьля паўгадовай валакіты ў пратаколе РКК ад 6 кастрычніка бюракратычна-ляканічна зазначана:

„Хадайніцтвы адхіліць".

Ці гэта прадстаўнік рабочай часткі? Добрыя кіраўнікі саюзу савецкіх і гандлёвых служачых даўно яго пагналі-б туды, дзе Макар цялят ня пасьвіў.

Ці Лучыцын, з другога боку, прадстаўнік адміністрацыі?

Разумны адміністратар не цягнуў-бы валакіты 6 месяцаў за 4 р. 52 к. Не сядзеў-бы сам і не марынаваў-бы на пасяджэньнях РКК іншых супрацоўнікаў. Але ён «адміністратар», дык пры такім, выбачайце, усё можа здарыцца.

Тытун Самасей.

АБУРАЮЧАЯ ВАЛАКІТА.

Як і кожную восень, сёлета з розных куткоў Беларусі з'ехалася моладзь, каб паспрабаваць шчасьця папасьці ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Шчасьця, мы кажам, таму, што нашы ВНУ далёка ня ўсіх жадаючых могуць прыняць у свае сьцены. Сярод прыехаўшых было шмат беднаты. Забясьпечыць усіх іх інтэрнатамі Наркамасьветы ня меў магчымасьці.

Шмат каму з моладзі прыходзілася галадаць і ня было за што выехаць дамоў пасьля таго, як даведаліся аб незалічэньні ў ВНУ.

Мы былі сьведкамі, як дзесяткі хлапцоў і дзяўчат прыходзілі ў НКА за дапамогай на дарогу, але сродкі НКА хутка былі скарыстаны, а нешчасьліўцы ўсё ішлі, ішлі...

24 жніўня Наркамасьветы просіць Савнарком адпусьціць сродкі для аказаньня дапамогі беднаце і батракам, якія ня маюць за што выехаць з Менску.

25 жніўня на адносіне НКА кладзецца рэзалюцыя: распарадчае пасяджэньне СНК (да гэтага ўзгадніць з НКФ).

Як бачым з справы, жываты моладзі ня церпяць, ня церпіць і час, а таму сэкратарыят СНК **толькі 28 жніўня тэрмінова прапануе НКФіну** даць сваё заключэньне і накіраваць у СНК да 2 верасьня.

Атрымалі ў Наркамфіне гэту паперку 29 жніўня, а як трэба было даслаць у СНК да 2 верасьня, дык, відаць, таму толькі 6 верасьня кладзецца рэзалюцыя:

«Тав. Сноргальскі, даць адмоўнае заключэньне»...

Заключэньне—гэта вам ня жарты: яно складалася да 8 верасьня. У заключэньні, паміж іншым, гаварылася: ...«дапамога, па думцы НКФ, можа быць зроблена Наркамасьветы за кошт свайго каштарысу»...

Абурылася начальства, што заключэньне не па сутнасьці рэзалюцыі, а абурыўшыся, толькі 11 верасьня пажыла другую рэзалюцыю: «Я супярэчу па сутнасьці. А. С.".

Раз супярэчыць, дык тут ужо трэба яшчэ раз папрапаваць над заключэньнем. Прапаваў нейкі чын, як гаворыцца, да сёмага поту цэлых 9 дзён і 20 верасьня было складзена другое заключэньне. У гэтым заключэньні ўжо ва Наркамасьветы сыплюцца гром і маланка. Нават Наркамфін ужо пратэстуе супроць зробленых НКА выдаткаў на дапамогу беднаце. Адным словам, ніякіх сродкаў Наркамасьветы не дасць і, наогул, забараніць дапамагаць.

З 20 верасьня да 10 кастрычніка гэтае заключэньне ляжала ў НКФ бяз ніякага руху. Кажуць, што паступаўшыя ў ВНУ хто пехатой, хто як, дабраліся да дому і некалькі тыдняў ужо працуюць на сваёй гаспадарцы. А ў Наркамфіне 10 кастрычніка на заключэньні ўжо новая рэзалюцыя:

„Т. Бальковічу.

Тав. Мікуліч паказаў, што ён ня супярэчыць, калі НКА знойдзе сродкі ў сваім каштарысе для выдачы дапамогі... Т».

Да 13 кастрычніка адказ Наркамфіну яшчэ не паехаў у СНК, ды здаецца, у ім і патрэбы ўжо ня было.

Сапраўды, ці змагалі-б цэлых 45 дзён чакаць хлопцы і дзяўчаты, якія сядзелі без капейкі і якім трэба было дабрацца дамоў.

Рабоча- Сялянская Інспэкцыя, спадзяёмся, скажа сваё цьвёрдае слова па гэтай абураючай валакіце.

В. Зайцаў.

АБ АСНОВАХ ЗЕМЛЯУПАРАДКАВАНЬНЯ І ЗЕМЛЯКАРЫСТАНЬНЯ*).

(ВЫНІКІ АБГАВАРЭНЬНЯ ПРАЭКТУ САЮЗНАГА ЗАКОНУ. ДАКЛАД т. ПРЫШЧЭПАВА НА ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦВК БССР).

Адносна правоў саюзнага ўраду. Гэтыя правы, галоўным чынам, зводзяцца да адводу канцэсій, да адводу калёнізацыйнага фонду, да адводу зямлі для розных іншых патрэб—пры правядзеньні чыгунак, пры адводзе зямлі для вайсковых патрэб ці для марскіх патрэб і г. д.

Па правох саюзных рэспублік мы ўносім зьмену ў арт. 4, пункт 9 (пакінуць). У чым сэнс гэтага артыкулу? Тое, што саюзныя рэспублікі могуць распараджацца ўсёю зямлёю, за выключэньнем тых, якія пашлі пад кіраўніцтва Саюзу. Выходзіць так, што гэтымі землямі саюзныя рэспублікі ня могуць кіраваць і ня могуць нават мець агульнага нагляду. Мы лічым, што вылучаць яшчэ саюзныя землі і праводзіць прынцып экстэрытарыяльнасьці немэтазгодна. Пагэтаму мы лічым, што ссылка на арт. 3 немэтазгодна, і трэба запісаць—„агульнае распараджэньне зямлёю рэспублік". Скажам, старшыня ЦВК зьяўляцца на тэрыторыю чыгунак і ён будзе на экстэрытарыяльнай зямлі. Мы лічым, што гэта практычнага значэньня ня мае, але на мясцох могуць быць такія непаразуменьні, і таму лічым неабходным ссылку на тое, што зямля зьяўляецца экстэрытарыяльнай, выкінуць (Чарвякоў: правільна).

Важнейшая папраўка ёсьць яшчэ да арт. 11. Тут праводзіцца такі прынцып, што ня можа быць нераўнапраўя пры земляўпарадкаваньні, пры землянадзяленьні і г. д. па прызнаках полу, веравызнаньня, нацыянальнасьці і па сацыяльнаму. Але трэба гэты артыкул расшыфраваць. У чым сутнасьць сацыяльнай часткі? Тут установка робіцца такая, што калі прыняць гэты артыкул бяз нашых папраўак, то выходзіць, што мы пры земляўпарадкаваньні павінны абавязкова дзяліць зямлю на едакоў, значыць, прыняць прынцып РСФСР і адмовіцца ад норм землякарыстаньня. Мы лічым, што пры нашай установцы і разьмеркаваньні зямлі па нормах, калі мы праводзім абрэзку кулацкіх гаспадарак, серадняцкія гаспадаркі пакідаем пры фактычным землякарыстаньні, і калі мы даналяляем бедняка, то гэты прынцып ва ўмовах БССР пры вучастковаподворным парадку землякарыстаньня ні ў якім выпадку прыняць нельга, і пагэтаму ад прынцыпу падзелу зямлі па едакох мы адмаўляемся і робім ссылку, што ў даным выпадку зямля можа разьмяркоўвацца па нормах, устаноўленых саюзнымі рэспублікамі.

Практыка паказала, што ў нас кулакоў пры нашай палітыцы ня больш, а менш, чым у тых рэспубліках, якія надзяляюць зямлю па едакох. Тое самае і з іншымі сацыяльнымі праслойкамі. Калі праводзіць ураўніўку, то атрымаецца, што мы ўвядзём абшчынны парадак землякарыстаньня, які фактычна не існаваў на тэрыторыі БССР, што выкліча дэзарганізацыю с.-г. вытворчасьці. Пагэтаму мы лічым неабходным у даны артыкул унесьці належную папраўку, і яе неабходна будзе прыняць.

Далей ёсьць адзін артыкул, які быў у першым праэкце асноў, дзе праводзіўся прынцып распаўсюджваньня абшчыннага парадку землякарыстаньня на ўвесь Саюз. Мы ўносім папраўку ў належны артыкул, і вучастковы падворны парадак прызнаецца гэтым самым законам. Ёсьць артыкул, што калі зямлю прыходзіцца адбіраць для дзяржаўных патрэб, для правядзеньня чыгунак, то дзеля таго, каб кампэнсаваць тых, ад якіх зямля адбіраецца, неабходна правесьці перадзел зямлі ў вобчастве—гэта значыць, праводзіцца чыста абшчынны прынцып. Мы яго адвяргаем і ўносім папраўку. Чаму? Таму, што калі абрэзка зямлі праводзілася, то землякарыстаньня іншых сялян мы не парушылі, і кожнае зямельнае вобчаства надзяляла зямлёй у іншым месцы. Мы лічым, што гэтую палітыку трэба будзе правесьці і ў далейшым.

У артыкул 20 мы ўносім такую папраўку адносна земляўпарадкаваньня. Мы лічым, што настаў час, калі мы можам паставіць пытаньне аб тым, што земляўпарадкаваньне ўсё цалкам павінна праводзіцца за кошт дзяржавы. Разглядаючы наш пэрспэктыўны план, Дзяржнізам саюзу запрапанаваў нам унесьці ў свой план выдаткі на земляўпарадкаваньне з тым, каб 65 проц. земляўпарадкаваньня было бясплатным. Але мы просім усё земляўпарадкаваньне ўзяць на кошт дзяржавы, бо 20-30 проц. матар'яльнага эфэкту не даюць, а пры цяперашняй рэгуляваць зямельныя адносіны надзвычайна цяжка. Тая частка, якая плаціць за земляўпарадкаваньне, тармозіць усю работу: зрываюць сходы, галасуюць супроць і г. д. Пагэтаму мы лічым, што зараз, паколькі гэтыя выдаткі на самую аплату земляўпарадкаваньня не такія ўжо страшныя, па гэтаму закону можна высунуць, як ідэю, перавод усяго земляўпарадкаваньня на кошт дзяржавы. У гэтым сэнсе выказалася нарада членаў ЦВК пры Сэсіі ЦВК.

Па гэтаму закону зусім выключаюцца даручэньні на земляўп

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

пра парадак вылічэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў у каштарысах на 1928-29 год дзяржаўных органаў, якія дзейнічаюць на аснове камерцыйнага (гаспадарчага) разрахунку, і мяшаных акцыйных таварыстваў.

На падставе арт. 5 пастановы Савету Народных Камісараў Саюзу ССР ва 8 верасьня 1928 г. «Пра парадак вылічэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў у каштарысах на 1928-29 год дзяржаўных органаў, якія дзейнічаюць на аснове камерцыйнага (гаспадарчага) разрахунку, і мяшаных акцыйных таварыстваў» (З. З. СССР 1928 г., № 57, арт. 509), Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць дзяржаўныя органы рэспубліканскага і мясцовага значэньня, якія дзейнічаюць на аснове камерцыйнага (гаспадарчага) разрахунку, а таксама мяшаныя акцыйныя таварыствы, якія рэгіструюцца ў Народным Камісарыяце Гандлю БССР, вылічаць асигнаваньні на адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі ў каштарысах на 1928-29 год, грунтуючыся на наступных асноўных палажэньнях:

а) адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі на 1928-29 год не павінны перавышаць адпаведных прызначэньняў у каштарысах на 1927-28 год, складзеных з 20 проц. скарачэньнем паказаных выдаткаў, паводле пастановы СНК СССР ва 30 жніўня 1927 г. „Аб скарачэньні адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў у каштарысах на 1927-28 г. (З. З. СССР 1927 г., № 53, арт. 542). Калі будзе павялічан аб'ём працы, паводле зацьверджанага на 1928-29 год. пляну супроць 1927-28 г. у прамысловых прадпрыёмствах больш, як на 17 проц. і ў гандлёвых прадпрыёмствах больш, як на 20 процантаў, то дазваляецца павялічваць на 1928-29 г. адпаведныя каштарысныя прызначэньні супроць прызначэньняў 1927-28 г., складзеных з падлікам 20 проц. скарачэньня;

б) асигнаваньні на адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі, прадугледжаныя ў каштарысах 1927-28 г. на патрэбы данага году, і на патрэбы, якія не паўтараюцца ў 1928-29 годзе, павінны быць выключаны пры вызначэньні разьмеру выдаткаў на 1928-29 г.;

в) прызначэньні на новыя выдаткі, якія прадугледжваюцца ў каштарысах на 1928-1929 г. упяршыню, не ўваходзяць у паказаны ў п. «а» гранічны разьмер адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў і ў каштарысах паказваюцца асобна;

г) пры ўстанаўленьні разьмеру каштарысных прызначэньняў на адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі на 1928-29 год, павінны грунтавацца на патрэбе далейшага зьніжэньня паказаных выдаткаў. Зьніжэньне гэта павінна быць ажыцьцёўлена праз рацыяналізацыю апарату, зьнішчэньне лішніх функцый яго, палепшаньне сыстэмы і мэтадаў працы, а таксама праз далейшае скарачэньне выдаткаў на ўтрыманьне і абслугоўваньне памяшканьняў кіраўнічых органаў, на камандыроўкі, паштова-тэлеграфных, транспартных і іншых выдаткаў і праз поўную забарону ўсялякіх выдаткаў, ня вызваных з непасрэднымі задачамі данага органу.

2. На Народны Камісарыят Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР ускладаецца праверка ажыцьцяўленьня гэтае пастановы.

3. Народным Камісарыятам БССР, якія маюць пад сваім ведамам паказаныя ў арт. 1 прадпрыёмствы рэспубліканскага значэньня, даручаецца, пасьля ўгадненьня з Народным Камісарыятам Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР, на працягу двох тыдняў выдаць інструкцыю пра ўжываньне гэтае пастановы. Адпаведная інструкцыя ў дачыненьні на прадпрыёмствы мясцовага значэньня выдаецца акруговымі выканаўчымі камітэтамі.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

18 кастрычніка 1928 году, г. Менск.

Постановление

Совета Народных Комиссаров БССР

о порядке исчисления административно-управленческих расходов по сметам на 1928-29 год государственных органов, действующих на началах коммерческого (хозяйственного расчета) и смешанных акционерных обществ.

На основании ст. 5 постановления Совета Народных Комиссаров Союза ССР от 8 сентября 1928 г. „О порядке исчисления административно-управленческих расходов по сметам на 1928-29 год государственных органов, действующих на началах коммерческого (хозяйственного) расчета, и смешанных акционерных обществ» (С. З. СССР 1928 г., № 57, ст. 509) Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Обязать государственные органы республиканского и местного значения, действующие на началах коммерческого (хозяйственного) расчета, а также смешанные акционерные общества, подлежащие регистрации в Народном Комиссариате Торговли БССР, производить исчисления административно-управленческих расходов по сметам на 1928-29 год, исходя из следующих основных положений:

а) административно-управленческие расходы на 1928-29 год не должны превышать соответствующих назначений по сметам на 1927-28 год, составленных в 20 пр. сокращением указанных расходов, на основании постановления СНК СССР от 30 августа 1927 г. „О сокращении административно-управленческих расходов по сметам на 1927-28 год“ (С. З. СССР 1927 г. № 53, ст. 542). В случае увеличения об'ема работ, согласно утвержденному на 1928-29 год плану против 1927-28 г. по промышленным предприятиям более, чем на 17 проц., и по торговым предприятиям более, чем на 20 проц., допускается увеличение на 1928-29 г. соответствующих сметных назначений против назначений 1927-28 г., составленных с учетом 20 проц. сокращения;

б) ассигнования на административно-управленческие расходы, предусмотренные по сметам 1927-28 г. на нужды данного года, которые не повторяются в 1928-29 году, должны быть исключены при установлении размера расходов на 1928-29 год;

в) назначения на новые расходы, предусматриваемые по сметам на 1928-29 г. впервые, не входят в указанный в п. „а“ предельный размер административно-управленческих расходов и в сметах показываются особо.

г) при установлении размера сметных назначений на административно-управленческие расходы на 1928-29 г., обязаны исходить из необходимости дальнейшего снижения указанных расходов. Снижение это должно быть осуществлено путем рационализации аппарата, устранении излишних функций, улучшения системы и методов работы, а также путем дальнейшего сокращения расходов на содержание и обслуживание помещений управленческих органов, на командировки, почтово-телеграфных, транспортных и других расходов, и полного прекращения расходования средств на цели, непосредственно не связанные с задачами данного органа.

2. На Народный Комиссариат Рабоче-Крестьянской Инспекции БССР возлагается проверка выполнения настоящего постановления.

3. Народным Комиссариатам БССР, имеющим в своем ведении указанные в ст. 1 предприятия республиканского значения, поручается, по согласованию с Народным Комиссариатом Рабоче-Крестьянской Инспекции БССР, в двухнедельный срок издать инструкцию по применению настоящего постановления.

Соответствующая инструкция в отношении предприятий местного значения издается окружными исполнительными комитетами.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР Л. Дубовицкий.

18 октября 1928 г., г. Минск.

Уздым саматужнай прамысловасьці ў Беларусі.

Водлуг апошніх вестак, у БССР налічваецца каля 84 тысяч саматужнікаў, з іх да 19 тысяч чалавек прыпадае на горад, да 13 тысяч на мястэчка і да 4-х тысяч—на вёску. У арцелях аб'яднаны 11-12 тысяч саматужнікаў, у пазыкова-ашчадных т-вах 25 тыс.

Пераважная прамысловасьць гарадоў і мястэчак зьяўляецца кравецкая і шавецкая, у сельскіх мясцовасьцях—смалакурная і дрэваапрацоўчая прамысловасьць

У апошні час беларускі саматужны прамысловы саюз пачаў разьвіцьцё арцеляй па выраву народнага ткацтва з нацыянальнымі беларускімі ўзорамі. У гэту галіну маюць быць упягнуты значныя кадры сялянства, што павінна даць добры прыбытак вёсцы. БССР таксама мае магчымасьці для разьвіцьця панчошна-трыкатажнай і галянтарэйнай прамысловасьці.

У канцы 5-цігодзі прадбачыцца ўцягнуць у трыкатажную прамысловасьць да 4000 чалавек.

Нажаль, уся сыстэма слаба забясьпечваецца крэдытамі, а таксама вострa стаіць пытаньне з забясьпячэньнем сыравіны, ня толькі завознай, але нават і мясцовай, асабліва драўнінай, з прычыны чаго вельмі церпяць дрэваапрацоўчыя арцелі.

У БССР знаходзяцца значныя кадры добракваліфікаваных гарбароў. Частка з іх будзе ўцягнута ў арцелі, частка павінна перакваліфікавацца на іншыя рамёствы. Зараз ужо ўцягнута ў шапавальную прамысловасьць каля 100 гарбароў, але гэты працэс уцягваньня павінен прадоўжвацца, бо валёнкі маюць у нас добры збыт.

Даволі прыбытковай і карыснай галінай на вёсцы павінна зьявіцца выраб цэглы, куды можна ўцягнуць значныя кадры сельскай беднаты. Гэта галіна прамысловасьці пачала ўжо ў нас разьвівацца. Калі будуць у патрэбнай меры адпушчаны крэдыты, то ў Бабруйскай акрузе ў наступным годзе будзе выпушчана арцелямі саматужнікаў да 3-х мільёнаў штук цэглы.

У далейшым трэба больш сур'ёзна заняцца саматужнай кааперацыяй. Забясьпячэньне сыравінай павінна праводзіцца больш плянава і сыстэматычна. Поруч з гэтым трэба шырока паставіць пытаньне аб крэдытах, бо бяз гэтага немажліва нармальнае разьвіцьцё саматужнай прамысловасьці.

Трэба больш шырока паставіць арганізацыю беларускіх вырабаў, як вышываньне беларускіх кашуль, паясоў і інш. рэчаў. Ад гэтых відаў ткацтва на Украіне добра зарабляюць.

ХРОНІКА.

Будаўніцтва Белдзяржгандлю.

У 1927-28 годзе Белдзяржгандлю было адпушчана з розных крэдыт 633500 руб. на пабудову заводаў, якія будуць працаваць на экспарт.

З усіх прадугледжаных плянам аб'ектаў будаўніцтва больш-менш здавальняюча праходзіць пабудова смалакурных, шпігінарных і кішачных заводаў. Будаўніцтва-ж бэконнага камбінату ў Воршы праходзіць з затрымкамі; на іншых-жа аб'ектах будаўнічага пляну нічога ня робіцца.

Слаба выконваецца плян будаўніцтва птушкаводных прадпрыёмстваў і рызьявой базы, што тлумачыцца позьнім вырашэньнем гэтага пытаньня ў Маскве і слабой падрыхтоўкай будаўніцтва з боку Белдзяржгандлю. За бязьдзейнасьць у гэтай галіне абвешчана вымова праўленьню Белдзяржгандлю.

Трэба адзначыць, што на будаўніцтва і пераабсталяваньне кішачных заводаў у Менску, Гомелі, Бабруйску і шэрагу дробных мястачак да канца будаўнічага сэзону сродкі будуць скарыстаны поўнасьцю. Будуць таксама поўнасьцю скарыстаны сродкі на будаўніцтва смалакураных заводаў і на дапасталяваньне шпігінарна-ачысьціцельных заводаў у Менцчыне і Полаччыне.

Наркамгандлю даў дырэктывы Белдзяржгандлю бездакладна скарыстаць вольныя ад будаўніцтва сродкі ў суме 166500 руб. на загатоўку розных будаўнічых матар'ялаў для наступнага будаўнічага сэзону.

Вывучаем свой край.

Залежы чырвонай фарбы.

У Аболіцкім сельсавеце, Кохапаўскага раёну ёсьць каля дзесяціны чырвонай зямлі, на якой нічога не расьце. Сяляне ўжываюць гэту зямлю для афарбоўкі дрэва. Фарба мае чырвоны бліскучы колер і добра трымаецца.

Знойдзена жалезная руда.

У Церахоўскім раёне супрапоўнік Гомельскага акрэа т. Рубінчык знайшоў пляц з значным пластом жалезнай руды. Па дасьледах выявілася, што руда мае да 90 проц. чыстага жалеза.

Прылады першабытнага чалавека.

Жыхар м. Уваравічы, Гомельскай акр. Лукомскі знайшоў у Чачэрску, у раёне, касьцяны нож-гарпун, які ўжываўся першабытным чалавекам для лоўлі рыбы. Гэта ўжо другі гарпун першабытнага чалавека, знойдзены на Беларусі (першы гарпун быў вывезены палякамі ў Прагу).

Дасьледваньне бабровых калёній.

Гомельскае акруговае краязнаўчае т-ва наладзіла правяло вывучэньне бабровых калёній у поўным шэрагу раёнаў. Экспэдыцыя выявіла 10 сем'яў баброў у Веткаўскім р. і ў шэрагу інш. раёнаў. Экспэдыцыя сабрала шмат бабровых хатак і інш. экспанатаў з жыцьця гэтае жывёлы.

Вывучэньне шкодзікаў.

Гомельскае краязнаўчае т-ва наладзіла сёлета экспэдыцыю па вывучэньню палявых шкодзікаў Гомельскай акр. Вынікам гэтае экспэдыцыі зьяўляецца брашура агранома Крылова аб шкодніках акругі, якая падрыхтавана да друку.

АДГРУЗКА ЎЖО СКОНЧАНА.

Гусей—на экспарт.

Першая партыя гусей з адкормачнага Быхаўскага пункту накіравана ў Менск для сартаваньня. Пасаджана на адкорм другая партыя гусей.

34 ГАТУНКОВЫЯ КНЫРЫ.

Менскі Акрэа атрымаў ад Наркамзему 34 гатунковыя кныры, якія былі вывезены з дзяржаўных племянных рассадзікаў РСФСР. Кныры будуць разьмешчаны па прыпускных пунктах шэрагу раёнаў.

Распаўсюджваньне 3-й авіёлётарэі.

ЦС ТДА-Авіяхіму БССР выпусьціў лістоўку аб распаўсюджваньні 3-й авіёлётарэі. Для БССР вызначана 75 тысяч білетаў. Водлуг паведамленьняў акруговых саветаў, усе 75 тысяч білетаў будуць распаўсюджаны.

Замежны друк аб БССР.

Балгарская літаратурная газэта «Літаратурні Новіни» надрукавала артыкул аб беларускай літаратуры.

У Гэльсінгфорскай рабочай газэце зьмешчан артыкул на тэму: «Культурныя дасягненьні БССР за 10 гадоў».

Японская газэта «Новая Культура» зьмясьціла артыкул «Культура Беларусі».

Культурная сувязь з-за межамі.

Гэтымі днямі Беларуская Дзяржаўная бібліятэта атрымала ад аб'яднаньня вузкавых устаноў Нямеччыны вялікую партыю вузкавых выданьняў.

З гэтым аб'яднаньнем Беларуская Дзяржаўная бібліятэка трымае шчыльную сувязь па кнігаабмену.

Сродні па правядзеньні суботніка дапамогі школе.

Белкаапсаюз адпусьціў 1000 руб. на арганізацыю суботніка дапамогі школе. Запрапанавана спажывецкім т-вам выдаваць школьнікам, бяднейшым пайшчыкаў, школьныя прылады.

Таксама запрапанавана кааперацыйнаму актыву прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні ўсесаюзнага камсамольскага суботніка дапамогі школе.

Суботнікі па збору лому.

У сучасны момант па гарадзкому раёну ЛКСМБ праводзяцца суботнікі па збору лому. Ужо праведзены камсамольскія суботнікі па збору лому на Эльводзе і заводзе «Камунар». Таксама праведзен суботнік ячэйкі ВСНГБ, якая сабрала—120 пуд. лому. Пытаньне аб збору лому будзе абгаварвацца на сходах камсамольскіх ячэек.

Мэханізацыя швэйнай прамысловасьці.

Управа Дзяржгандлю БССР атрымала для швэйнай прамысловасьці БССР 186 розных машын з Амэрыкі. Машын разьмеркаваны паміж фабрыкамі „Меншвэй“ і „Вітшвэй“.

Управа Дзяржгандлю БССР вывісала з Амэрыкі вялікую партыю швэйных машын для гомельскай швэйнай фабрыкі.

За парушэньне дырэктыў—да адказнасьці.

Пар. Кам. Гандлю БССР зьвярнуўся да пракурора рэспублікі з просьбай прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці вінаватых асоб з Гомельскага, Магілёўскага, Артанскага, Менскага і іншых аддзяленьняў Саюзхлеба за продаж цукру прыватным асобам, чым была парушана пастанова Пар. Кам. Гандлю БССР аб плянавым разьмеркаваньні рэсурсаў цукру.

Зьніжэньне будаўнічага індэксу.

Пры капітальным будаўніцтве мясцовай прамысловасьці Менскай акругі ў працягу 5-годзьдзя будуць праводзіцца ў жыцьцё наступныя якасныя паказальнікі: будаўнічы індэкс за 5-цігодзьдзе будзе зьніжан на 30 проц., сабекошт прадукцыі—на 15 проц., зарплата будзе павялічана на 12-15 проц.

Да аднаўленьня выбарчых правоў.

Для разгляду заяў аб аднаўленьні ў выбарчых правах гр-н Менскай акругі арганізаван рабочы прэзыдыум Менскай акруговай выбарчай камісіі.

На барацьбу з алкагалізмам.

14 лістапада адбылася нарада савету па барацьбе з алкагалізмам. Нарада пастанавіла арганізаваць курсы інструктароў на барацьбе з алкагалізмам. Пастаноўлена гэтыя курсы адчыніць не пазьней 20-га лістапада. Курсы разьлічаны на 30 чал. Нарада таксама пастанавіла склікаць агульна-гарадзкую канфэрэнцыю па пытаньнях барацьбы з алкагалізмам.

Новы парадак выдачы малака.

З мэтай ліквідацыі чаргі ў малочных крамах, праўленьне Менскага Цэрабкопу пастанавіла ўвесьці абанэмэнтную сыстэму выдачы малака. Абанэменты будуць выдавацца на 2 тыдні. Разьмяркоўваць іх будуць загадчыкі крам сумесна з кааперацыйнымі камісіямі. Малако будзе выдавацца ў крамах №№ 60, 41, 31, 39, 22, 55, 9, 6, 24, 38, 10, 34, 56.

Дом на 70 кватэр.

Сёлета закончана кладка сьцен 70-цікватэрнага дому на рагу Камсамольскай і Універсытэцкай вул.

Канчаткова пабудова гэтага дому мае быць скончана ў кастрычніку 1929 году.

„Белы арол“.

(Кіно Культура).

Царскі саноўнік. Яго падначальны—губарнатар. Паліцмэйстар. Стачка на заводах, Правакацыя. Расстрэлы.

Вось канва тэй «рэвалюцыйнай драмы», якую хацеў стварыць з матар'ялаў аповесьці Леаніда Андрэева рэжысэр Пратазанаў.

Аповесьць Л. Андрэева «Губарнатар» настолькі ўстарэла, што нават такі таленавіты рэжысэр, як Пратазанаў, які даў савецкай кінематаграфіі цэлы шэраг выдатных фільмаў, нічога ня мог зрабіць з ёю.

І сапраўды, што астаецца ў фільме «Белы арол», калі з яго выкінуць непатрэбныя мэлядраматычныя перажываньні губарнатара за расстрэл рабочых і дзяцей? Не астаецца нічога. Матар'ял для Пратазанава панаў вельмі нядзённы.

Губарнатар—забойца, але які забойца? Губарнатар, які фактычна здаволен нагрозаю за расстрэл рабочых, мучыцца, бачыце, перажывае надзвычайна цяжкія душэўныя моманты з прычыны таго, што неяк „выпадкова“ растраляў рабочых, жанчын і дзяцей. Па фільму выходзіць, што забойца ён выпадковы. Нават артысты Качалаў, ігра якога да тонкасьцяў праходзіць памастацку, нічога ня мог зрабіць з гэтымі нікчэмнымі перажываньнямі.

Добра, як нельга лепей, паказан цар. Фактычна паказан ня цар, а яго рука, якая піша «прочел с удовольствіем». Мэтад паказу цэлага праз адну невялічкую, але характэрную дэталь, зьяўляецца ўпрыгожаньнем савецкай кінематаграфіі.

Цікава спынімся на пачатку фільму. Пачынаецца ён з вядомай сымбалістыкі, якою пачынаецца цэлы шэраг іншых савецкіх фільмаў, як напрыклад: „Потемкин“, «Мать», „Конец С.-Петербурга“ і інш. Праз гэта пачатак фільму нікога ня цікавіць, бо ён—штамп.

Артыст Мэйерхольд за сваю надзвычайную ігру заслугоўвае вялікай увагі. Мэйерхольд у поўнай меры стварыў яскравы тып бяздушнага, агіднага царскага саноўніка.

Артыст Пятроўскі ў ролі паліцмэйстара даў цудоўны вобраз губарнатарскага падхалімы. Варта адзначыць ігру Чувелева ў ролі правакатара, Ганны Стэн у ролі губернаткі і інш.

Ня глядзячы на добры склад артыстаў, увесь фільм усё-ж не дае рэвалюцыйнай драмы, якую хацеў стварыць рэжысэр Пратазанаў.

С. Аз.

Апавяшчэньні.

— У суботу 17 г. м. а 8 гадз. увеч. у памяшканьні Кам. Унів. Бел. (аўдыторыя № 26) адбудзецца пасяджэньне ЭКАНАМІЧНАЙ СЭКЦЫІ НАВУКОВАГА Т-ВА МАРКСІСТЫХ.

Парадак дня: Даклад т. Пятровіча на тэму: 1) Гаспадарчыя задачы 1928-29 г. у БССР у сьвеце пэрспэктыўнага пляну. 2) План працы сэкцыі.

Просьба да членаў зьявіцца своечасова

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня 16 лістапада лекцыя А. Коссіні на тэму „Увесь сьвет“. Лекцыя суправаждаецца дыапазытывамі.

Пачатак а 8 гадз. увечары.

Білеты ад 10—25 к.

Менскі дзень.

— Наркамасьветы мяркуе ў бліжэйшым часе наміраваць у Гомельшчыну Беларускі Дзяржаўны Вандроўны Тэатр пад кіраўніцтвам Галубка.

Белрабсэкцыя заключыла дадатковы дагавор з Бялсельтрэстам па дастаўку рабочай кааперацыі да 5000 пуд. галяндзкага сыру. Апрача таго, заключаны дагавор з Белмясгандлем на поўнае забясьпечаньне цэрабкопаў мясам.

Сярод літоўцаў.

Школа для літоўскай моладзі.

У м-ку Бабінавічы, Высачанскага раёну, Віцебскай акругі адчынілася школа пашыранага тыпу для літоўскай сялянскай моладзі. Пры гэтай школе адчыняецца інтэрнат, які будзе абслугоўваць бяднейшых вучняў. Школа будзе абслугоўваць літоўскую моладзь усей Віцебскай акругі.

Газэта «Чырвоны араты» выходзіць штотыднёва.

Да гэтага часу літоўская газэта «Чырвоны араты» выходзіла 2 разы ў месяц. З 1 лістапада газэта ўжо выходзіць штотыднёва.

Падручнікі для літоўскіх школ.

Гэтымі днямі Белдзяржвыдавецтва атрымала з Літвы партыю літоўскіх кніг. Кнігі закуплены для літоўскіх культурна-асьветных устаноў БССР.

На днях выдавецтва Масквы выпускае арытмэтычны задачнік на літоўскай мове, для літоўскіх школ.

Сельская гаспадарка.

Ход пасадкі групавых садоў.

Водлуг вестак Наркамзему, ва ўсіх акругах зараз актыўна праходзіць пасадка групавых садоў. У некаторых акругах засаджана нават больш, чым было вызначана па пляну.

На наступны год мяркуецца плян групавых садоў павялічыць да 2000 гэкт. Дзеля таго, каб стварыць нармальныя ўмовы для гадаваньня шчэпаў у патрэбнай колькасьці маюць быць арганізаваны ў БССР 5-6 буйных садова-гародных дзяржаўных баз.

Дасьледваньне гаспадаркі Сіцько.

Нядаўна закончыла сваю працу камісія, у склад якой уваходзілі супрацоўнікі Наркамзему і Беларускага Дасьледчага Інстытуту, па дасьледаваньню садовай гаспадаркі селяніна Сіцько, якая знаходзіцца на хут. Лучкі, каля м-ка Капаткевічы, Мазырскай акругі.

Сіцько пачаў разводзіць свой сад з 1914 г. Да гэтага часу ён пасьпеў выгадаваць цалы шэраг цікавых гатункаў яблык і груш, шлякам гібрыдызацыі. Апроч гэтага, Сіцько пачаў разводзіць вінаград і пэрсікі.

Камісія прызнала, што гаспадарка Сіцько зьяўляецца вельмі цікавай з навуковага боку і можа даць шмат цікавага ў справе стварэньня новых каштоўных гатункаў садавіны.

Культпраца сярод пайшчыкаў

Пры Белкаапсаюзе створан цэнтралізаваны культфонд. На сродкі культфонду будзе выдавацца кааперацыйная літаратура; закуплены кааперацыйнага бібліятэчкі-перасоўкі. Апрача гэтага, на гэтыя сродкі будзе праводзіцца кінафікацыя вёскі і арганізаваны курсы для райсаюзаў. Па гэтыя сродкі мяркуецца таксама арганізаваць шэраг экскурсій кааперацыйнага актыву ў іншыя раёны СССР для азнаямленьня з пастаноўкай кааперацыйнай справы.

Страхавая агэнтура і задачы мясцовых органаў улады.

Страхавая агэнтура мае вялікае значэньне ў працы дзяржаўнага страхаваньня на вёсцы. Вось чаму ад наладжанасьці страхавога апарату ў значнай меры будзе залежаць посьпех дзяржаўнага страхаваньня на вёсцы.

За апошні час характар працы агэнта Дзяржстраху значна зьмяніўся. Раней у руках яго знаходзілася ўся праца на дзяржаўнаму страхаваньню. Пасьля выданьня адпаведнага дэкрэту СНК СССР рэгістрацыя страхуемай маемасьці была перададзена мясцовым органам улады, а на тэрыторыі Беларусі райвыканкомам быў перададзены і збор акладных страхавых плацяжоў. Такім чынам страхавая агэнтура аслабанілася ад працы па рэгістрацыі і збору акладу і атрымала больш вольнага часу для другой працы—налічэньне акладу, ліквідацыя страт, пашырэньне дабраахвотнага страхаваньня і г. д.

Зараз перад страхагэнтам стаіць задача весьці працу ў якасьці арганізатара страхавой справы.

Перад страхавымі агэнтамі ў сучасны момант стаяць наступныя задачы.

У галіне рэгістрацыі страхавых аб'ектаў агэнт павінен граць ролю арганізатара. Ён павінен інструктаваць сельсаветы ў тым, як праводзіць рэгістрацыю. Страхавы агэнт павінен сачыць за ходам збору акладу, ад своечасовасьцю выкананьня заданьня і точным праведзеньнем у жыцьцё абвязкаў, якія ўрад усклаў на апарат райвыканкомаў. Праца па налічэньні акладных плацяжаў вастаецца цалкам у агэнта, які на свой страх павінен арганізаваць і скончыць налічэньне аклада своечасова.

Самая асноўная і самая важная функцыя агэнта — гэта ліквідацыя страт.

У галіне разьвіцьця дабраахвотных відаў страхаваньня стаіць зусім іншая задача.

Цэнтр цяжару ў гэтай працы агэнт павінен перанесьці на арганізацыю аквізітарскай сеткі, на яе інструктаваньне і кантраляваньне. Агэнт тут павінен, як правіла, адмовіцца ад включэньня дабраахвотнага страхаваньня непасрэдна.

Перад райвыканкомамі стаіць задача аказаць садзейнічаньне страхавому агэнту ў яго працы.

У сваю чаргу райвыканкомы, як органы савецкай улады ў вёсцы, абавязаны праводзіць сыстэматычны кантроль працы страхавых агэнтаў. Апошнія павінны рабіць справаздачы на яменных райвыканкомаў, высьвятляючы сваю працу перад прадстаўнікамі мясцовага насельніцтва.

ПАДРЫХТОЎКА ДА 10-ЦІГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ ЖАНАДДЗЕЛАЎ.

10-цігадовы юбілей жанаддзелаў будзе адзначан арганізацыяй цэлага шэрагу дзіцячых садоў, ясьляў, курсаў і інш.

З 1-га па 15-га сьнежня будзе адзначан 10-цігадовы юбілей жанаддзелаў.

У сувязі з гэтым 13-га лістапада пры Менскім акруговым жанаддзеле адбылася шырокая нарада па пытаньню падрыхтоўкі да адзначаньня 10-цігадовага юбілею жанаддзелаў.

Нарада пастанавіла выдаць да часу юбілею зборнік дасягненьняў на рабоце сярод жанчын Менскай акругі за 10 гадоў.

У часе юбілею па клюбах, саюзах і прадпрыёмствах будуць праводзіцца агульныя сходы і вечары рабочых, прысьвечаныя юбілею.

У Доме Культуры будзе арганізован вялікі вечар дасягненьняў жанаддзелаў за 10 год па лініях аховы матэрынства і младзенцтва, сацыяльнага выхаваньня, народнага харчаваньня і г. д. Там-жа будзе арганізавана выстаўка дасягненьняў з дыяграмамі, характарызуючая працу сярод жанчын.

На гэтай нарадзе былі таксама заслуханы інфармацыі асобных арганізацый аб іх падрыхтоўцы да азначэньня 10-цігадовага юбілею жанаддзелаў.

Менскі Цэрабкоп адзначыць 10-цігадовы юбілей жанаддзелаў адчыненьнем новай культурнай сталовай. Праца ў магазыне «Маці і дзіця» будзе значна палепшана. У магазыне будзе арганізавана бібліятэка і выстаўка па аховe матэрынства і младзенства і сацыяльнага выхаваньня дзяцей. Будзе таксама папыран існуючы пры МЦРК дзіцячы сад на 45 дзяцей.

Менскае аддзяленьне Белкаапсаюзу пастанавіла арганізаваць на сяканчэньні т-вах акругі спэцыяльныя паліцы для забясьпечаньня матэрак. Гэткіх паліц мяркуецца адчыніць каля 18-19.

Апрача гэтага, Менскім аддзяленьнем Белкаапсаюзу будуць адчынены яслі ў Бярэзінскім раёне і 3 гурткі кройкі і шыцьця—у Койданаўскім, Астравецкім Гарадзенкім раёнах і ў Новым Дварэ, Слуцкавалавіцкага раёну. У час юбілею будзе таксама зьвернута асаблівая ўвага на накіраваньне жанчын-бяднячак і работніц савгасаў.

На пасаду старшыні Менскага аддзяленьня Белкаапсаюзу вылучаецца жанчына.

Аддзел сацыкультуры Менскай акруговай інспэкцыі Нар. Асьветы адзначыць 10-цігадзьдзе жанаддзелаў адчыненьнем дзіцячага саду пры буйным саўгасе, 2 дадатковыя групы пры 9-м беларускім і 2-м яўрэйскім дзіцячых садох. Да часу юбілею таксама прыстасоўваецца адчыненьне дзіцячых садоў пры ДПУ і беларускім саматужна-прамысловым саюзе і дзіцячага пакою пры доме працасьветы.

Апрача гэтага будуць арганізаваны пересовачны музэй-кансультацыя і 4-5 курсаў у горадзе для матак дзяцей дзіцячых садоў.

Стан азімых пасеваў па БССР.

Па даных Цэнтральнай Статыстычнай Управы БССР, стан азімых пасеваў па БССР на 1-га лістапада мае наступны выгляд:

Полацкая акруга—жыта—3,1 была, пшаніца—3,0; Віцебская—жыта—3,0, пшаніца—3,0; Аршанская—жыта—2,9 пшаніца—2,6; Менская — жыта—3,0 пшаніца—3,0; Магілеўская—жыта—3,2, пшаніца—3,0; Бабруйская—жыта—3,0. пшаніца—2,8; Мазырская—жыта—3,0 і пшаніца—2,9. Гомельская—жыта—3,2, пшаніца 3,2.

Рознае.

РУІНЫ РЫМСКІХ МОГІЛАК У ІНДЫІ.

У Лёндонскіх газэтах надрукавана, што ў аколіцах Бамбея (Індыя) знойдзены руіны рымскіх могілак. Як прыпушчаюць, яны адносяцца к I веку хрысьціянскай эры.

НАЙВЫШЭЙШЫ ДОМ У СЬВЕЦЕ.

1 лютага 1929 г. у Чыкаго будуць расчаты работы па пабудове найбольшага ў сьвеце дома ў 75 паверхаў. Агульны кошт пабудовы будзе раўняцца 45 мілёнам даляраў. У ім магчыма будзе жыць 18000 асоб, а на пабудову яго пойдзе 85.000.000 клгр. алюй толькі сталі. Паверхная пагадкі будзе мець 8.639.094 кв. мэтраў. Будынак будзе закончаны ўвосень наступнага году.

ЛАСІ І ВАЎКІ Ў КОВЕНШЧЫНЕ.

У ваколіцах Бэйсагоды ўказаліся рэдкія і выміраючыя ўжо ў Літве ласі.

Праўдзівую сэнсацыю выклікалі нядаўна два ласі, якія, карыстаючыся, відаць, раніцяшні цішай, прайшлі на расьвеце праз м. Бэйсагоду і скрыліся ў бліжэйшым лесе.

Часьцейшым госьцем, галоўным чынам, на вёсцы, зьяўляюцца ваўкі. Найбольш яны гуляюць у ваколіцы Лаздзей, дзе цэлыя стаі іх сярод белага дня рэжуць авечак і нават кароў і коняй.

БУНТ ПАПУАСАЎ-ЛЮДАЕДАЎ.

У Галяндзкай Гвінеі, на высьпе Ява, папуасы забілі і, падсмажыўшы на вогнішчы, з'елі 15 галяндзкіх паліцыянтаў, якія прыехалі ў вёску спагнаць падаткі. Уладу адказала на гэты ўчынак людаедаў тым спосабам, што сваліла ўсю вёску дагэта.

Перадача малюнкаў па радыё ў СССР.

Тры з паловай гады таму назад у Ленінградзе пачалася падвойная праца над з раўніцтвам вынаходцы Шорына: рабіўся апарат ведьмі складаны і спэцыяльны дзеля перадачы на вялікія адлегласьці малюнкаў з дасканалаецю таго, і адначасна рабіўся тапы і просты апарат для аматараў дзеля прыёму простых штрыхавых малюнкаў.

Абедзьве гэтыя задачы зараз выпрацаны з посьпехам.

Перадача малюнкаў па радыё—гэта толькі шлях, якім мы ідзём далей,—заявіў Шорын. Наступны крок—гэта перадача рукавой рэчы, напрыклад, кіно-карціны з Ленінграду ў Сібір або на Далёкі Ўсход. Хутка мы і гэтага дасягнем.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
ПЯТНІЦА, 16 ЛІСТАПАДА
Для прафсаюзаў „БРОНЕЦЯГНІК 14---69“
Рэвал. п'еса ў 6 абраз. Ус. Іваноў.
Білеты праз рабочую касу. ПАЧАТАК А 8 ГАДЗ. УВЕЧАРЫ.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». Народн. арт. рэспублікі УС. МЭЙЕРХОЛЬД В. І. КАЧАЛОЎ У СУСЬВЕТНЫМ ФІЛЬМЕ „БЕЛЫ АРОЛ“.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“. Ад аўторка 13 лістапада „КАХАНЬНЕ КАРАЛЕВЫ“ гіст. трагэдыя ў 8 частках. Звыш праграмы: 3 прычыны вялікага посьпеху 2-гі тыдзень гастроляў РОБІ ГУД і памфлетыста Зін. ЗАДОРЫНА.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». Ад аўторка, 13 лістапада „ГОНШЧЫК СУПРОЦЬ ВОЛІ“ Вясёлая камэдыя ў 6 частках. Звыш праграмы—кіно-хроніка савкіно.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР“ „Пат і Паташон на моры“ у 6 частках. Кошт білета 15 кап. Пачатак сэансаў а 3 з пал. гадз.

РЭДАКЦЫЯ ЧАСОПІСІ „АСЬВЕТА“ паведамляе, што ўвесь першы нумар „АСЬВЕТЫ“ за 1928 г. разышоўся. На гэты нумар заказы здаволены ня будуць. Іншыя нумары (2-6) ёсьць у невялікай колькасьці. У інтарэсах падпісчыкаў просьба прысылаць падпіску на „АСЬВЕТУ“ загадзя. Гэтымі днямі выходзіць „АСЬВЕТА“ № 7. Нумар прысьвечаны пераважна справе выхаваньня ў школах. Высьвятляюцца пытаньні антырэлігійн